ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ

ЗАЧЫНЕЙНАЯ ГАЗЕТА ГАРКОМУ КПСС, ГАРСАВЕТУ І ГАРПРАФСАВЕТУ.

№ 191 | Субота, 29 жніўня 1931 г. | № 191

ЦЕНЫ НУМАРУ Ў ГАРАДЗЕ І РАЁНАХ 5 КАП.

Рэдакцыя: Палац працы, 3-ці паверх, пак. 39, 40, 41, 42. Тэлеф. агульны . 2-08, „ рэдактара 1-73, „ сакрат. і п-рм . . 72.

Падпісная цана ў месяц: Для рабочых, служачых і калгаспікаў . . . — р. 80 к. Для ўстаноў . . . . 1 „ — „ З дадаткам „Чырвоная Беларусь": Для рабочых, служачых і калгаспікаў . . . 1 „ — „ Для ўстаноў . . . 1 „ 50 „

Цана на абвесткі: За радок нутыту . . . . . 30 кап. Для інвалідаў . . . . . 40 „ Цана шматгаловых [illegible] ад 20 да 50 проц.

ГОД ВЫДАННЯ 14-ты.

Пленум гарсавету

Сёньня, 29-га жніўня, а 18 гадз., у Палацу працы (пакой № 11), **склікаецца пленум гарсавету**. На абвестцы дню:

1) Даклад аб ходзе перабудовы працы спажыўкаапэрацыі і становішчы рабочага забясьпечаньня (дакладчыкі т.т. **Шпілёў і Наўпас**).

2) Вынікі справаздачнай кампаніі гарсавету (дакладчык т. **Праконенка**).

На пленум павінны зьявіцца бязумоўна ў абавязковым парадку **ўсе члены і кандыдаты гарсавету**, якія павінны быць вызвалены на гэты час ад сваёй асноўнай працы, з іх рабочыя на вытворчасьці, працуючыя ў гэты дзень на вячэрніх зьменах, павінны быць пераведзены на іншыя зьмены. Павінен таксама зьявіцца актыў, прымацаваны да сэкцый, вольны ў гэты час ад працы. Запрашаюцца старшыні фабкомаў прадпрыемстваў і ўстаноў, старшыні ЗРК і каапактыў.

Праца пленуму пачнецца роўна ў паказаны час.

Рэгістрацыя з 17 гадз там-жа.

Прэзыдыум гарсавету.

НА УБОРКУ ГАРОДНІНЫ КІНУЦЬ СІЛЫ

Дна ліквідаваўшы прарыў у праполцы, працоўныя гораду з няменшай энэргіяй павінны змагацца за ліквідацыю прарываў ва ўборцы

ЗАРГАНІЗУЕМ МАСАВЫЯ СУБОТНІКІ НА ПАЛЁХ ПРЫГАРАДНЫХ ГАСПАДАРАК

Мабілізаваць масы на свечасовую ўборку гародніны

Найнейшы рост плодагадоўлі мінулага з тым, каб па бальшавіцку сабраць з палёў збожжа і гародніну.

Мы маем 8 прыгарадных гаспадарак, куды зараз павінны накіраваць галоўную дапамогу. Каб у час скончыць уборачную кампанію, патрабуецца адпрацоўка 27.220 чалавека дзён. Гэта значыць, што калі кожны рабочы, кожны член прафсаюзу адпрацуе па 1 дню, мы зможам у два разы перавыканаць гэтую лічбу.

Але справа, вядома, ня толькі ў колькасьці. Мы сур'ёзна ставім пытаньне перад кожным, ідучым працаваць у гаспадарку аб неабходнасьці перанясеньня сапраўдна ударнага вопыту працы ў вытворчасьці на саўгасныя палі з тым, каб ня толькі выконваць існуючыя нормы выпрацоўкі, але перавыконваць іх, даючы гэтым самым прыклад для рабочых саўгасаў.

Зараз усім прадпрыемствам разасланы кантрольныя лічбы пасылкі рабочых брыгад. Ад выкананьня іх і ад актыўнага ўдзелу ўсяго пралетарыяту гораду залежыць пасьпяховае правядзеньне другой бальшавіцкай уборкі ўраджаю, праз гэта—палепшаньне забясьпечаньня рабочых гораду.

Абрасімаў.

Кантрольныя лічбы пасылкі рабочых брыгад у прыгарадныя гаспадаркі на час уборачнай кампаніі (штодзённа—да 20-га кастрычніка)

Каапгас «Новы сьвет»

«Сьцяг індустрыялізацыі»—30 чал., ф-ка «Прафінтэрн»—20, МК ЦРК—10, голкавая фабрыка—5, ГК каапработнікаў—7, ГК мэталістых—3, курсы ЦІП'а—3, ФЗВ краўцоў—6, кравецкі тэхнікум—5.

Каапгас імя т. Молатава

Мэтпром—30 чал., «Камінтэрн»—5, саюз працасьветы—15, саюз камунальнікаў—15, саюз транс—5, ГК будаўнікоў № 1—10, ГК будаўнікоў № 2—10, ФЗВ мэталістых—10.

Каапгас—„МОПР"

Панчошная—20 чал., нархарч—10, ГК будаўнікоў № 6—7, вуп'эдтэхнікум—7.

Каапгас „Новы шлях"

Шчацінная фабрыка—7 чал., воласапрадзільная—5, шчотачная—7, мэдсанпрацы—15, працмастацтва—6, пажарная камавда—4, камтрэст—12, МК ДПО—4.

Каапгас „Янопаль"

Фабрыка Лекерта—20 чал., «Праграс»—7, махорачная—7, сьпіртазавод—6, хлебазавод—5, ГК харчавікоў—6.

Каапгас „Тулава"

Акулярная—30 чал., ложакавая—6, інструмэнтальная—10.

Каапгас „Білева"

Скурзавод—20 чал., нарсувязь—10, друкарня «Камінтэрн» 10, МК гарсавету—10.

Каапгас „Парыская камуна"

Фабрыка «Дзьвіна»—25 чал., фанэрны завод—10 маслазавод—10, лесазавод № 3—7, уцільбаза—15, ГК будаўнікоў № 10—5, ФЗВ фабрыкі «Дзьвіна»—10, палітэхнікум—10, мэханічны тэхнікум—10, вэтінстытут—20, лесазавод № 13—15, рабфакі—10.

Пад суд за ігнараваньне зьдзельшчыны

Тэхнічны дырэктар каапгасу «Тулава» Арцішэўскі сьвядома зрывае правядзеньне зьдзельшчыны. Прыклад, калі рабочы выпрацуе норму, згодна ўстаноўленых расцэнак, Арцішэўскі дае распараджэньне запісаць падзённа, г. зн. 2 р. 7 к.

РСІ павінна зацікавіцца гэтай справай і зрабіць адпаведныя вывады ў адносінах Арцішэўскага, бо яго праца накіравана да разлажэньня каапгасу.

Вярба.

Замест 28 чаноў есьць толькі 8

Каапгас «Новы сьвет» гарадметам вытворчасьці гародніна. Усе каапгасы павінна быць нацэлены на захаваньне гародніны ў засолкі і закваскі. Закваскі капусты маецца акрамя таго прыступіць да вырабу новых 28 чаноў тон капусты. Пабудаваць чаноў ідзе чарапашанам з прычыны адсутнасьці матар'ялу: дошак, цьвіхоў, смалы і інш.

Да гэта часу пабудавана чаноў. Тэрмін закваскі капусты ўжо набліжаецца, а чанамі каапгас поўнасьцю не забясьпечаны.

Для шыткаваньня капусты неабходна было зрабіць электраправодку і ўстанавіць 4 маторы, бо шыткоўка ўручную патрабуе шмат часу і якасьць прадукцыі пагаршаецца, але «Сельэлектра» з-за адсутнасьці матар'ялу адмовіўся гэта зрабіць.

Каапгас здае большую частку сваёй прадукцыі крамам ЦРК і ЗРК швэйнікаў і інш. Аднак, дагавор ЗРК швэйнікаў з каапгасам да гэтага часу не заключыў.

Забясьпечаньне каапгасу рабсілай з боку фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» нездавальняючае. У апошні час прыходзяць на працу 7—8 чал. замест 60—65 чал. Адносіны да працы і якасьць працы некаторых рабочых швэйнікаў вельмі дрэнныя, так, напрыклад—у некаторых мясцох прапалолі маркоўку так, што нічога не засталася.

Гарсавету неабходна прыняць меры да забясьпечаньня каапгасу патрэбнымі матар'яламі для сканчэньня будоўлі заквасных пунктаў і мэханізацыі шыткоўкі капусты.

Фабрыка «Сьцяг індустрыялізацыі» павінна ўзмацніць дапамогу каапгасу ў час уборкі з тым, каб атрымаць ад яго патрэбную колькасьць гародніны для забясьпечаньня на зіму ўсіх рабочых швэйнікаў, магазынаў і сталовак ЗРК.

Брыгада:

Курноў, Прышчэпаў, Жук.

БАРАЦЬБА ЗА ТОРП

МАЛА ЗДАБЫЦЬ ТОРП, ТРЭБА ЯГО ВЫСУШЫЦЬ І ЗАХАВАЦЬ ЯКАСЬЦЬ

НА 20-ГА ЖНІЎНЯ НА ЗАВОДЗЕ „ЧЫРВОНЫ ТАРПЯНІК" ВЫСУШАНА 51,3 ПРОЦАНТАЎ СЭЗОННАГА ЗАДАНЬНЯ

ФАРСІРАВАЦЬ СУШКУ І ЎКЛАДКУ ТОРПА Ў ШТАБЕЛІ

Ня зьніжаць тэмпаў торпаздабычы

Торпазавод „Чырвоны тарпянік" на 27 жніўня выканаў сэзоннае заданьне па торпаздабычы на 105,5 проц. Выканаўшы поўнасьцю плянавае заданьне, «Чырвоны тарпянік» высунуў сустрэчны — давесьці выкананьне пляну да 112 проц. Зьвесткі апошніх дзён паказваюць, што завод пачынае здаваць тэмпы і ствараецца пагроза невыкананьня сустрэчнага пляну. Гэтага ўдарнікі заводу ні ў якім разе не павінны дапусьціць. Спасылкі на „аб'ектыўныя» прычыны не павінны мець месца. Сустрэчны плян павінен быць выканан.

На 26 жніўня выкананьне пляну па брыгадам складае наступны малюнак: брыгада Праворнага—105,4 проц., Іванова—99,9 проц., Васільлева—97,6 проц., Пятухова—96,3 проц. Ручныя рэзчыкі здабылі 361 тону. Лепшыя ўдарнікі тарпянога фронту павінны быць прэміраваны; іх вопыт павінен быць перанесены на астатнія працэсы работ завода.

Высушана на 20 жніўня 51,3% сэзоннага заданьня. Гэта лічба зьяўляецца недастатковай. Зараз галоўнай задачай заводу павінна зьявіцца—сушка торпа і захоўваньне яго якасьці.

Неабходна прыняць усе захады для таго, каб выканаць сустрэчны плян торпаздабычы, высушыць торп і паслаць спажыўцу добраякасны апал.

На торпзаводзе „Чырвоны тарпянік"

Сутачнае заданьне 116 тон

25 жніўня	26 жніўня	27 жніўня
82,6 тон.	76,2 тон.	78,8 тон.

Сэзоннае заданьне выканана на 105,5 проц.

ПАЗЫКА „ТРЭЦІ РАШАЮЧЫ"

МАБІЛІЗАВАЦЬ УСЕ СІЛЫ на завяршэньне падпіскі на пазыку СЯРОД АДНААСОБНІКАЎ

Першы ўзнос сабраць поўнасьцю

Аднаасобнікі могуць набыць пазыку ў растэрміноўку

Вельмі многія аднаасобнікі, не жадаючы адставаць ад калгасьнікаў, заяўляюць аб жаданьні набыць пазыку на 30—50 руб. Але так як унесьці адразу такую суму для іх цяжка, дык яны ня могуць набыць пазыкі столькі, колькі жадалі-б.

Наркамфін СССР, улічваючы гэта становішча, знайшоў магчымым прадаставіць аднаасобнікам права набываць пазыку ў растэрміноўку, аплачваючы аблігацыі не адразу, а ў некалькі тэрмінаў, але з тым, што ўся сума будзе выплачана да 1 га ліста пада 1931 года.

Для гэтага ўстаноўлены спэцыяльны парадак разрахункаў. Кожны аднаасобнік, жадаючы купіць пазыку ў растэрміноўку, частку сумы ўносіць безадкладна наяўнымі грашыма і павінен запоўніць падпісны ліст, дакладна паказаўшы ў ім, на якую суму ён жадае набыць пазыку, якога выпуску—процантнага альбо бяспроцантнага-бяспрэйгрышнага, у якія тэрміны і ў якім разьмеры ён будзе ўнасіць плацяжы і якую суму ўнёс пры падпісцы.

Усё гэта павінна быць падцьвержджана ўласнаручнай расьпіскай выяўшага жаданьне набыць пазыку. Сельсавет або ўпаўнаважаны, прымаючы такую заяўку, павінен абавязкова выдаць падпісаўшамуся на тую суму аблігацый, якая ўнесена, як першы плацёж. Пры гэтым трэба адзначыць, што для ўпрашчэньня разьлікаў кожны плацёж павінен быць раўны аднэй якой небудзь частцы аблігацыі (5 руб., 10 руб. і г. д.).

У некаторых сельсаветах продаж пазыкі ў растэрміноўку зразумелі неправільна і пачалі зьбіраць падпіску сярод аднаасобнікаў без атрыманьня першага ўзносу, без пакаданьня разьмераў і тэрмінаў чаргова га плацяжу, а растэрміноўку даюць на 8—10 месяцаў і г. д.

Зачастую нерэальная падпіска ўлічваецца як рэалізацыя пазыкі, што затушоўвае сучаснае становішча справы з разьмяшчэньнем пазыкі.

Наркамфін СССР растлумачвае, што адзіным паказчыкам выкананьня пляну рэалізацыі пазыкі сярод аднаасобнікаў было і заставецца паступленьне наяўных грошай, а ня тая сума, якая паказана ў падпісных лістох.

Асноўнае—сабраць сродкі, рэалізаваць пазыку за наяўны разрахунак

У касавыя пляны на трэцьці квартал уключаны і тыя сумы, якія павінны паступаць па новай пазыцы. Першы плацёж 1/20 усёй сумы падпіскі рабочых і служачых павінен быў паступіць 15 га жніўня. Значныя сумы ўжо павінны былі паступіць па падпісцы калгасьнікаў і за аблігацыі, разьмяшчаемыя сярод аднаасобнікаў за наяўны разрахунак.

Сабраць падпіску ва ўмовах, калі выпуск пазыкі спатканы з вялізарным энтузіязмам—гэта толькі палова справы. Другая, ня менш сур'ёзная палова працы—аформіць падпіску, забясьпечыць свечасовае паступленьне плацяжоў, а праз гэта—выкананьне касавага пляну. Але як раз гэта другая палова працы праводзіцца недазушчальна кепска.

Па дадзеным Наркамфіну СССР на 25-га ліпеня па сельскаму сэктару павінна было паступіць па пазыцы «3-га рашаючага»—**30 млн. рублёў**., фактычна ж паступіла — **6 млн. 600 тысяч рублёў**. Гэта значыць, што недапаступіла 23 млн. 400 тысяч рублёў. **Такое становішча зьявілася вынікам таго, што мясцовыя арганізацыі, замчэўшыся рэалізацыяй пазыкі, недастаткова ўдзялілі ўвагі арганізацыі паступленьня сродкаў.** Такога становішча на было-б, калі-б уся крэдытная сыстэма перабудавала сваю работу і камісіі садзейнічаньня на практыцы ажыцьцявілі кантроль за прасоўваньнем сродкаў.

Не паслабляючы, а наадварот, узмацняючы тэмпы разьмяшчэньня пазыкі як сярод калгасьнікаў, так і асабліва—сярод аднаасобнікаў, трэба асаблівую ўвагу ўдзяліць арганізацыі шпаркага і бесьперабойнага паступленьня сродкаў, памятуючы, што цэнтрам усёй працы па рэалізацыі пазыкі цяпер павінна быць пытаньне аб зборы сродкаў па прынятай ужо падпісцы і продажы аблігацый за наяўны разьлік. У адпаведнасьці з тым новым этапам, у які уступае кампанія па рэалізацыі пазыкі «3 і рашаючы», павінна быць перабудавана ўся работа камісій садзейнічаньня сельсаветаў, фінансава-крэдытных органаў з тым, каб ня толькі арганізаваць паступленьне сродкаў, але і хутка прасоўваць іх у банк на рахунак Наркамфіну Саюзу. У гэтых умовах асаблівую важнасьць набывае пытаньне правільнай і чоткай работы ўпаўнаважаных і контр-агентаў сельсаветаў, зьбіраючых грошы па падпісцы і прадаючых аблігацыі за наяўныя грошы.

Трэба ва штоб то ні стала ўсім сельсаветам нашага раёну дабіцца такога становішча, каб контр-агенты і ўпаўнаважаныя штодзённа здавалі сабраныя сродкі і гэтыя сродкі тэрмінова перавадзіліся-б у ашчадкасы і дзяржбанк.

Толькі такая перабудова работы можа забясьпечыць выкананьне пляну паступленьня сродкаў па пазыцы.

На гэтым не супакоіцца

Заданьне па рэалізацыі пазыкі па Віцебскаму сельсавету 12.260 руб., з іх па калгаснаму—4.500 р. і паасобнаму—7.650 р. На 25-га жніўня пазыка па калгаснаму сэктару была рэалізавана на 7000 руб., а па аднаасобнаму толькі на 4000 руб. Але, дзякуючы разгарнуўшайся растлумачальнай працы, заданьне і па аднаасобнаму сэктару выканана. Усё ж неабходна адзначыць, што ня ўсе аднаасобнікі ахоплены падпіскай на пазыку. Трэба дабіцца 100-проц. ахопу падпіскай усіх калгасьнікаў і аднаасобнікаў. Брыгадзір Ліля.

Неабходна дабіцца пералому

Цагельныя заводы плятуцца ў хвасьце па рэалізацыі пазыкі „3 ці рашаючы". Парт'ячэйка і астатнія арганізацыі праводзяць недастатковую растлумачальную працу і калі на цагельных заводах прамтрэсту месячны заробак складае 39 тысяч рублёў, дык пазыка рэалізавана толькі на 12850 р. Сэзоньнікі амаль зусім не ахоплены падпіскай. Абоз цагельнага заводу, заробак якога складае 11 тысяч. руб., падпісаўся на пазыку толькі на 7815 руб.

Трэба дабіцца пералому ў рэалізацыі пазыкі.

М. Басін.

Макданальд—Балдуінаўскі ўрад выпрацаваў праграму наступу на рабочую клясу

Іх меншасьці заклікаюць рабочых к рашучаму адпору

Так званы «нацыянальны» Англіі зацьвердзіў ня вядзеньня мер эканоміі, заходзяць: скарачэньне дапамогі па беспрацоўнасьці, скарачэньне пэнсіі дзяржслужачых, увядзеньне раду но, скараченьне выдаткаў, скарачэньне выдаткаў на народнай асьвеце і перавыборы ў лібэральныя і лібэральныя на ўсе лады расхвалі Макданальда і яго ўрадаў з «рабочай» партыі.

Амэрыканскіх банкіраў і палкам ухваляюць Макданальда, выражаюць надзею, што дзімае Макданальдам дапамогі беспрацоўных ціць уплыў і на Амэрыканскім сэнсе, што паслабіць ціск ва ўвядзеньне ў Амэрыцы захаваньня ад беспрацоўя.

Англійская канфэрэнцыя генсавету і ўніёнаў (прафсаюзы) і ранкому лейбарысцкай партыі прыняла рэзалюцыю, якая асуджае паводзіны Макданальда і прапамэнцкай фракцыі лейбарыстаў (рабочай партыі) гарадскім парлямэнце супроць

Англійская кампартыя і прафсаюзны рух меншасьці ў адозве да ўсіх рабочых Англіі заяўляюць, што рабочыя павінны рашуча выступіць супроць рабоўніцкіх праэктаў ураду і не спадзявацца на тое, што рэфармісты з генсавету трэдюніонаў і выканкому „рабочай" партыі будуць сапраўды не на словах, а на справе бараніць інтарэсы рабочых. Скрозь на вуліцах, у фабрычных брам рабочыя павінны наладжваць мітынгі і дэманстрацыі пад лёзунгамі: «ніводнай капейкі з дапамогі рабочых. Ніводнай капейкі новых падаткаў на харчы, ніводнай капейкі з зарплаты працоўных».

У Лёндане, каля раённых бірж працы, беспрацоўныя ўжо ўчора спрабавалі наладжваць дэманстрацыі. Паліцыя разганяла беспрацоўных. З розных канцоў Англіі паведамляюць, што прафсаюзныя і іншыя рабочыя арганізацыі прымаюць рэзалюцыі пратэсту супроць «нацыянальнага» ураду і здрадніцкай палітыкі рэфармістых, эканоміі за кошт працоўных.

Макданальд на службе ў банкіраў

Ён даводзіць беспрацоўным, што ім карысна галадаць

ЛЁНДАН. Як высьвятляецца, праграма наступу на рабочую клясу, у тым ліку 10-процантнае зьніжэньне дапамогі беспрацоўным, была прынята Макданальдам пад нажымам амэрыканскіх банкіраў, якія дзейнічалі ў згодзе з англійскімі банкірамі. Пасьля стварэньня новага ўраду Макданальд—гэты прыслужнік банкіраў—сказаў па радыё прамову, у якой заявіў, што ўступіўшы ў саюз з кансэрватарамі, ён выканаў толькі свой нацыянальны абавязак. Ён лічыць, што накладаемы крызісам цяжар павінен быць аднолькавым для ўсіх: і для багатых і для бедных. Па яго словах, важны не інтарэсы рабочае клясы, а інтарэсы ўсёй нацыі.

Далей Макданальд нахабна заявіў, што беспрацоўным будзе карысна зьніжэньне дапамогі на 10 проц., бо ў працоўным выпадку разразіцца фінансавы крызіс і прыдзецца панесьці яшчэ большыя ахвяры.

У нізах рабочай партыі нездавальненьне палітыкай Макданальда ўсё больш павялічваецца. У зьвязку з гэтым паасобныя арганізацыі патрабуюць выключэньня Макданальда, Сноўдэна і Томаса з рабочай партыі.

Рэвалюцыйная прафапазыцыя арганізуе барацьбу рабочых масі

БЭРЛІН. На падставе новага надзвычайнага дэкрэту Брунінга, абласныя ўрады і гарадзкія самакіраўніцтвы Нямеччыны прыступілі да выкананьня праграмы эканоміі за кошт працоўных мас. Бэрлінскае самакіраўніцтва пастанавіла скараціць зарплату камунальным работнікам на 20 проц., паменшыць выдаткі на школы, дапамогу і інш. Саксонскі ўрад абвясьціў, што служачым будзе выплачана толькі трэцяя частка верасьнёўскай пэнсіі, а астатнія дзьве трэці—у залежнасьці ад будучага фінансавага становішча. У розных гарадох Рурскай і Ніжня-рэйнскай абласьцей, дзе зарплата камунальнікам ужо зьніжана, узгарэліся забастоўкі ў розных галінах камунальнай гаспадаркі: транспарт, газ і інш.

Пад кіраўніцтвам прафапазыцыі адбываюцца мітынгі і дэманстрацыі пратэсту супроць надзвычайных дэкрэтаў і зьніжэньня зарплаты.

Міжнародная хроніка

ПАРЫЖ. Тэлеграфнае агенцтва Гавас паведамляе, што ў сталіцы Партугаліі—Лісабоне адбылося паўстаньне некалькіх вайсковых частак у тым ліку і авіацыйных. Пасьля боек на вуліцах паўстаньне было прыдушана. Падрабязнасьці невядомы.

БЭРЛІН. Паводле зьвестак нямецкага інстытуту эканамічных досьледаў, даходы нямецкіх рабочых і служачых за другі квартал бягучага году скараціліся на 12 проц. супроць другога кварталу мінулага году.

У двухдэкоднік агляду і дапомогі радыё ўцягнуць шырокія рабочыя і калгасныя масы

З 1-га па 20-е верасьня па Саюзу праводзіцца двухдэкаднік агляду і дапамогі радыё. У мэтах разгортваньня двухдэкадніка, як масава-палітычнай кампаніі, за асваеньне радыётэхнікі шырокімі масамі рабочых і калгасьнікаў, за рэканструкцыю радыёвяшчаньня і ператварэньня радыё ў магутны сродак барацьбы за перабудову прафработы, УсеЦСПС прапанаваў усім прафарганізацыям прыняць актыўны ўдзел у правядзеньні двухдэкадніка агляду і дапамогі радыё і ўмацаваньні т-ва „Прыхільнікі радыё".

На мясцох павінны быць арганізаваны спэцыяльныя аглядавыя брыгады для праверкі становішча радыёфікацыі, радыёбудаўніцтва і радыёвяшчаньня на фабрыцы, заводзе, у раёне. Неабходна таксама праверыць падрыхтоўку радыёкадраў, асабліва ў сельскіх раёнах.

Ад'езд тав. Літвінава ў Жэневу

МАСКВА, 26 жніўня. Савецкая дэлегацыя на чале з наркомам замежных спраў тав. Літвінавым выехала ў Жэневу для прыняцьця ўдзелу ў работах панэўрапейскай камісіі.

ПАРТВУЧОБА — ВАЖНЕЙШЫ ВУЧАСТАК ПАРТЫЙНАЙ РАБОТ

15-га верасьня пачынаюцца заняткі ў сыстэме партасьветы ў горадзе і 1-га кастрычніка—па раёна

УЗМАЦНІЦЬ ТЭМПЫ ПАДРЫХТОЎКІ

На парозе новага навучальнага году

Партыйная вучоба ва ўмовах трэцяга рашаючага году пяцігодкі, ва ўмовах разгорнутага сацыялістычнага наступу набывае вялікае значэньне.

Нябачны размах сацыялістычнага будаўніцтва ўцягвае ва ўсе галіны нашае гаспадаркі ўсё новыя і новыя масы працоўных. Наша партыя бязупынна і шпарка расьце і папаўняе свае шэрагі лепшымі ўдарнікамі сацыялістычнай будоўлі. Клясавы вораг, у абставінах жорсткае клясавае барацьбы, карыстаючыся цяжкасьцямі нашага росту, усімі сіламі імкнецца сваёй агітацыяй пашкодзіць пасьпяховаму росту сацыялістычнае гаспадаркі.

Усё гэта падкрэсьлівае асабліва вялікае значэньне марксысцка-ленінскае вучобы. Усё гэта перад кожным партыйцам войстра ставіць пытаньне аб неабходнасьці правільнага разуменьня і марксысцка-ленінскага аналізу кожнага кроку практычнае работы, расцэньваючы яго з пункту погляду генэральнае лініі нашае партыі.

Практычнае ажыцьцяўленьне задач, якія стаяць перад кожным партыйцам, вымагае павышэньня яго ідэалёгічнай устойлівасьці і клясавае баяздольнасьці.

Пастановай гаркому КП(б)Б новы навучальны год у сетцы партыйнае асьветы па гораду распачынаецца 15-га верасьня, а на вёсны—1-га кастрычніка. Засталіся лічаныя дні. Патрэбна зараз-жа прыступіць да падрыхтоўчае працы, каб за гэты кароткі тэрмін часу прывесьці ўсё ў поўную баявую гатоўнасьць да пачатку заняткаў.

У гэтым навучальным годзе патрэбна адразу ўлічыць памылкі і недахопы, якія мелі месца ў мінулым годзе.

Трэба адзначыць наступныя, больш распаўсюджаныя адмоўныя зьявішчы: амаль ва ўсёй сетцы партасьветы назіраўся значны адсеў. Прычыны адсеву—ячэйкі і парткалектывы правялі недастатковую растлумачальную работу ў тых ячэйках, дзе падрыхтоўчая работа была праведзена здавальняюча, дасягненьні з прычыны кампанейскага мэтаду работы ня былі замацаваны.

Ячэйкі павінны зараз-жа распачаць сыстэматычную штодзённую растлумачальную работу ў цэху, у зьмене, у брыгадзе, каб усе рабочыя добра ведалі, якія гурткі арганізуюцца на прадпрыемстве і дзе і калі яны будуць займацца. Пры ўкамплектаваньні трэба пэрсанальна падыходзіць да кожнага партыйца, камсамольца, рабочага, улічваючы яго палітычнае і агульна адукацыйнае разьвіцьцё і ўмовы яго работы. У гэтым годзе не павінна быць месца выпадкам бяздушнага, бюракратычнага разьмеркаваньня ўсяе ячэйкі і рабочых прадпрыемства «ў адзін прысест», адным чалавекам.

Найбольш важным вучасткам у партасьвеце зьяўляюцца прапагандысты. Трэба зараз жа зьвярнуць на гэта асаблівую ўвагу. Неабходна ўлічыць усе палітычна-пісьменныя партыйныя кадры, якія могуць работаць у сетцы партасьветы.

Задача бюро ячэйкі альбо калектыву заключаюцца ў тым, каб разгрузіць прапагандыстага ад тае вялікай грамадзкай работы, якой амаль ўсе яны нагружаны, абавязаўшы іх лепш рыхтавацца да заняткаў, лепш арганізаваць вучобу.

Дому камасьветы неабходна арганізаваць сэмінары для прапагандыстых. Арганізацыя стала дзейнічаючага сэмінарыя прапагандыстых дапаможа абагульваць дадатны вопыт і забясьпечыць сталую мэтадычную дапамогу.

У мінулым навучальным годзе значная частка сеткі працавала на расійскай мове. У гэтым годзе трэба зрабіць рашучы пералом у бок пераводу работы ўсяе сеткі партасьветы на беларускую мову, адначасова забясьпечыўшы ўсе нацменаўскія гурткі выкладаньнем на іх роднай мове.

Бюро гаркому ставіць перад партячэйкамі задачу—уцягнуць у сетку партасьветы 20—25 проц. жанчын і ня менш 30—60 проц. беспартыйных. Гэтым самым бюро гаркому ставіць перад ячэйкамі задачу шырокай вярбоўкі ў сыстэму партыйнай асьветы камсамольцаў, перадавых ударнікаў—рабочых і калгасьнікаў—і падкрэсьлівае важнасьць падрыхтоўкі гэтага рэзэрву да ўступленьня ў партыю.

Лёзунг тав. Сталіна «бальшавікі павінны аўладаць тэхнікай»—абавязвае сетку партыйнай асьветы вывучэньне тэхнікі паставіць у шэрагу з задачамі выхаваньня палітычна-сьвядомага, партыйна вытрыманага бальшавіка-ленінца. Партсетка павінна садзейнічаць тэхнічнаму ўзбраеньню, павышэньню кваліфікацыі слухачоў школы, даць штуршок для далейшай спэцыялізацыі.

Сацспаборніцтва і ўдарніцтва павінны разгарнуцца ў сетцы партасьветы значна шырэй, чымся ў мінулым годзе. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва павінны стаць сталым мэтадам у працы ўсёй сеткі.

У некаторых ячэйках сустракаюцца антыпартыйныя думкі—быццам арганізацыя і кіраўніцтва партвучобай—справа прапагандыста (дэло МББ чыг.).

«Бюро асабліва падкрэсьлівае, што за партвучобу адказвае ня толькі прапагандысты, але партыраўніцтва ячэйкі, калектыў наогул». (З пастановы бюро ГК).

Увязка работы сеткі партыйнай асьветы з практычнай працай партыйнай арганізацыі па ажыцьцяўленьню чарговых палітычна-гаспадарчых задач — вазнейшая задача партыйнай асьветы.

У мінулым навучальным годзе шмат гурткоў і школ ня выканалі гэтай галоўнай дырэктывы. Школы ў большасьці ня былі ініцыятарамі, застрэльшчыкамі і арганізатарамі па ліквідацыі прарываў, па высоўваньні сустрэчнага прамфінпляну і г. д. Трэба ўлічыць гэты буйны недахоп мінулага году.

Трэба заўсёды выходзіць з таго, што нам патрэбна ня вучоба «наогул», а вучоба, якая будзе дапамагаць партыі ў яе рабоце па будаўніцтву сацыялізму. Партыйная вучоба павінна ідэёва ўзброіць кожнага камуніста для практычнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, для барацьбы з ідэалёгіяй і практыкай усіх адхіленьняў ад генэральнай лініі нашае партыі.

Палітвучоба павінна стаць лепшым мэтадам мабілізацыі шырокіх працоўных мас на барацьбу за ажыцьцяўленьне вялікага пляну сацыялістычнае будоўлі.

Паказчыкам работы гуртка альбо школы будзе зьяўляцца ня толькі тое, колькі раз займаўся гурток, альбо які процант слухачоў наведвае рэгулярна заняткі; якасьць палітвучобы, станоўчыя бакі яе вызначаюцца галоўным чынам тым, на колькі школа змагла выхаваць з сваіх слухачоў актыўных барацьбітоў за правядзеньне ў жыцьцё рашэньняў партыі, у якой меры тое альбо іншае зьявіно партасьветы садзейнічае пасьпяховаму правядзеньню гаспадарча палітычных мерапрыемстваў.

Школа, гурток толькі тады будуць добра работаць, калі імі будзе забясьпечана непасрэдная сувязь і дапамога ў правядзеньні практычных задач партарганізацыі на прадпрыемстве, у саўгасе, калгасе, калі будзе пасьпяхова выкананы вытворчы план, калі ўсе рабочыя будуць ахоплены ўдарніцтвам і сацспаборніцтвам, калі сярод рабочых будзе добра праводзіцца агітацыйна-растлумачальная работа, калі будзе рашучы пералом у партыю лепшых ударнікаў - рабочых і калгасьнікаў.

Гаўсі.

ПАСТАНОВА

бюро гаркому КП(б)Б аб партвучобе ў 1931—32 навучальным годзе

Выходзячы з пастановы ЦК КП(б)Б аб разгортваньні сеткі партасьветы на новы навучальны год і пастановы ліпеньскага пленуму гаркому КП(б)Б, бюро гаркому **пастанаўляе:**

1. У аснову ўсёй сеткі партасьветы палажыць наступную сыстэму: па гораду—**нізавым зьвяном** павінны зьяўляцца кандыдацкія гурткі з 1½—2-месячным тэрмінам навучаньня, першапачатковыя школы з 4-месячным тэрмінам навучаньня, школы аднадзёнкі, гурткі бягучай палітыкі.

Сярэднім зьвяном партыйнай асьветы зьяўляюцца ВСПШ з 2-гадовым тэрмінам навучаньня, прадметныя гурткі, гурткі па вывучэньню паасобных пытаньняў, кароткатэрміновыя—3, 5, 10-дзённыя курсы, СПШ па радыё.

2. Арганізаваць усю сыстэму нізавога і сярэдняга зьвяна партасьветы па вытворчаму прынцыпу (фабрыка, завод, цэх, куст, зьмена, брыгада і інш.).

Арганізаваць пры доме партасьветы базавую ВСПШ для абслугоўваньня раздробленых прадпрыемстваў.

Вышэйшым зьвяном партыйнай асьветы зьяўляецца вячэрні, дэкадны і завочны камвузы.

3. Асноўнай формай партсеткі на вёсцы лічыць наступную: першапачатковая школа з 4-месячным тэрмінам навучаньня, школа-пераходка з 1½—2-месячным тэрмінам навучаньня, школы-аднадзёнкі, курсы-пераходкі для партактыву.

Стварыць адну базавую ВСПШ з двухгадовым тэрмінам навучаньня пры вясковым парткоме.

4. Улічваючы высокі процант жанчын, занятых на вытворчасьці, уцягнуць іх у партсетку ня менш 25—30 проц. усяго складу слухачоў. Парткалектывам і ячэйкам КП(б)Б шырэй разгарнуць растлумачальную працу сярод рабочых, асабліва ўдарнікаў, дамагаючыся іх уцягненьня ў партсетку. Беспартыйнымі павінна быць укамплектавана ня менш 30—60 проц. усёй сеткі партасьветы.

5. У новым навучальным годзе адчыніць на фабрыцы «Дзьвіна», МББ і панчошнай ф-цы польскія партшколы; на фабрыках: «Сьцяг індустрыялізацыі», «Праф інтэрн», імя Лекерта, панчошнай, скурзаводзе — яўрэйскія школы, у латыскім клюбе—латыскую школу. Культпропу выявіць маючыяся нацменаўскія прапагандысцкія кадры.

На МББ і ў Маркаўшчыне адчыніць дэкадныя камвузы, як філіялы вячэрняга камвузу.

Парткалектывам і ячэйкам КП(б)Б шырэй разгарнуць форму завочнага навучаньня, абсталяваць для гэтай мэты радыё-габінэты на «Дзьвіне», „Чырвоным мэталісьце", фанэрным заводзе, у клюбе „Суботнік" і клюбе «Парыская камуна».

Культпропу гаркому прасачыць за правядзеньнем гэтага мерапрыемства, устанавіўшы штодзённае кіраўніцтва завочным навучаньнем. Арганізаваць пры доме Камасьветы сталую кансультацыю для завочнікаў.

З мэтай забясьпячэньня сеткі партасьветы прапагандыстымі і выкладчыцкімі кадрамі зрабіць па ячэйках вучот усіх прапагандысцкіх сіл, прыцягнуўшы іх да работы ў партсетцы. Забараніць бяз ведама культпропу пасылаць прапагандыстых на розныя кампаніі. Мабілізаваць 50 студэнтаў рабфакаў, тэхнікумаў і вузаў для работы ў партсетцы.

Уключыць у праграму партсеткі тэхнічныя і агульна-адукацыйныя прадметы.

6. Вызначыць наступныя дні партвучобы для нізавога і сярэдняга зьвяна: 3, 7, 10, 13, 17, 20, 23 і 27.

Катэгарычна папярэдзіць партыйныя ячэйкі, калектывы і фракцыі, што ў гэтыя дні не павінна праводзіцца ніякіх паседжаньняў, нарад і сходаў. Гэтыя дні цалкам павінны быць скарыстаны для партвучобы.

Дні для заняткаў вячэрняга камвузу прызначыць наступныя: 2, 3, 4, 7, 8, 12, 13, 14, 17, 18, 22, 23 24, 27 і 28, з іх 10—12 заняткаў студэнты праводзяць у памяшканьні камвузу.

Культпропу ГК і бюро парткалектываў устанавіць сыстэматычнае штодзённае кіраўніцтва і праверку становішча партыйна-прапагандысцкай работы. Бюро асабліва падкрэсьлівае, што за партвучобу адказвае ня толькі прапагандысты, але і парткіраўніцтва ячэйкі, калектыву—наогул.

7. Не пазьней 5-га верасьня культпропу гаркому правесьці агульна-гарадзкую нараду прапагандыстых разам з культпропсэктарамі партячэек па пытаньнях новага навучальнага году.

15-га верасьня на ўсіх сходах шырока абгаварыць пытаньне аб партвучобе

17-га верасьня абвясьціць у горадзе дзень партвучобы.

Культпропу правесьці адна дзённыя курсы арганізатараў партвучобы на вёсцы. Паслаць на вёску дзьве брыгады прапагандыстых для дапамогі ў арганізацыі і ўкамплектаваньні партсеткі.

Распачаць новы навучальны год па гораду з 15-га верасьня, а на вёсцы—з 1-га кастрычніка.

8. 26-га верасьня на бюро гаркому КП(б)Б заслухаць інфармацыю культпропу аб ходзе і разгортваньні работы сеткі партасьветы.

9. Газэце «Віцебскі Пралетары», шматтыражкам і насьценным газэтам шырока асьвятляць ход падрыхтоўкі да новага навучальнага году.

Укамплектаваньню вячэрняга вузу—максымум увагі

Ва ўмовах гіганцкіх посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва і ўсё ўзрастаючай актыўнасьці рабочай клясы, задача падвышэньня тэарэтычнага ўзроўню, узбраеньня марксысцка-ленінскімі ведамі ўсёй партыйнай арганізацыі і ў асаблівасьці партактыву, набывае асаблівае значэньне.

Зараз, у зьвязку з надыходзячым пачаткам новага навучальнага году, неабходна ўзмацніць тэмпы падрыхтоўкі да вучобы ў кожнай ячэйцы, шырока растлумачыць перад партыйнай масай задачу ўзбраеньня партыйнай арганізацыі марксысцка-ленінскімі ведамі для яшчэ большага ўзьняцьця баяздольнасьці яе на фронце практычнага ажыцьцяўленьня гаспадарча палітычных задач партыі ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва і далейшай барацьбы партыі на два фронты, асабліва супроць правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі.

Нягледзячы на наяўнасьць за апошнія гады зруху ў сэнсэ павышэньня тэарэтычнага ўзроўню партыйнага актыву, **неабходна ўсё-ж такі прывянаць**, што тэмпы росту тэарэтычнага ўзроўню партыйнага актыву яшчэ адстаюць ад тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва. З гэтым становішчам мірыцца нельга—задача ясная: ліквідаваць гэта адставаньне ў самы найкарацейшы тэрмін.

Забясьпечыць практычнае правядзеньне вярбоўкі ў вячэрні камвуз, захоўваючы добрахвотнасьць выбару форм партыйнай вучобы для кожнага партыйца, неабходна памятаць, што няма і ня можа быць ніводнага члена партыі па-запартыйнай вучобе

Існаваўшы ў мінулым годзе вячэрні камвуз меў вялікія недахопы, як правільна ў свой час адзначыла брыгада культпропу ЦК КП(б)Б, абследаваўшая становішча партыйнай вучобы ў віцебскай арганізацыі.

Гэтымі недахопамі зьяўляліся: нязначны процант рабочых-партыйцаў, частыя зрывы заняткаў па прычыне скліканьня розных нарад у гэтыя дні, слабы ўдзел у камвузе сярэдняга партыйнага актыву, але самы галоўны недахоп гэта тое, што камвуз ня меў яскравай мэтавай устаноўкі.

Пастановай бюро Гаркому КП(б)Б вячэрні камвуз рашуча перабудоўваецца, ён ператвараецца у 3-гадовы вячэрні камвуз з 5-цю самастойнымі аддзяленьнямі, маючы сваёй задачай падрыхтоўку кіруючых кадраў: партыйных, прапагандыстых, савецка гаспадарчых, вайсковых, газэтных і камсамольскіх работнікаў для віцебскай арганізацыі.

Нягледзячы на тое, што ў гэтым годзе падрыхтоўка і практычная праца па ўкамплектаваньн... няга камвузу была разгор... часова, што парткалектыв... сваечасова атрымалі ра... мы ўсё-ж павінны канстат... вярбоўка ў вячэрні камвуз... ца ў яўна нездавальняюч... вішча.

На ўсе аддзяленьні вяч... вузу павінна было быць... На сёньняшні дзень коль... дадзеных заяў надта дале... тай лічбы. Пытаньне ўкамп... ня вячэрняга камвузу яшч... прадметам увагі ячэек.

Зусім няправільнымі і н... ваючымі ніякай увагі з... размовы сэкратароў пааса... ек аб тым, што «ў нас н... дыходзіць для камвузу». ... прывесьці тое, што для п... ня ў вячэрні камвуз п... толькі 2-гадовы партыйн... для жанчын нават 1 год... веды толькі ў аб'ёме вяч... партшколы, каб пераканат... рунтаванасьці разважань... таварышоў.

Укамплектаваньне вяч... вузу поўнасьцю залежыц... насьці ў гэтым пытаньні ... ячэек і партыйных калект... кі пры актыўнай працы ... калектываў і ячэек і зац... ці шырокіх мас партыйна... магчыма будзе выканаць... ныя на вячэрні камвуз за...

Віцебская партыйная ... можа і павінна поўнасьцю ... таваць вячэрні камвуз.

У мэтах большага ахо... арганізацыі партыйнай ... чыгуначным транспарце... не у гэтым годзе арга... кадныя камвузы як філ... няга камвузу для партый... ву з разьлікам па 100 ... ным.

Рашэньнем бюро ГК ... бясьпечваюцца адпавед... працы для вылучаных у... чоба ў вячэрнім камвузе... ваецца да выкананьня ... нагрузак і ў адпаведнасц... партыйныя ячэйкі павін... за выкананьнем апошня...

Камандыраваныя ў вяч... аслабяняюцца ад усіх ... гаспадарчых і грамадзкі... акрамя наведваньня пар... даў.

У мэтах лепшага аб... рабочых, занятых на ро... нах, вучоба ў вячэрнім ... вінна быць прыстасаван...

Вячэрні камвуз павін... чы недахопы працы мін... паставіць працу так, каб ... наму зрабіць вячэрні к... шай школай партыйнай ...

Забясьпечыць сваечасовы пачатак заняткаў у сетцы партасьветы

Падрыхтоўка да асеньня-зімовай партыйнай вучобы, якая павінна была зараз заняць адно з галоўнейшых месц у рабоце парткалектываў і ячэек, да сёньняшняга дню, не знайшла яшчэ свайго належнага месца ў рабоце шэрагу парткалектываў і ячэек.

Аб гэтым сьведчуць факты.

На акуляриай фабрыцы

летняя партыйная вучоба была поўнасьцю правалена. Існаваўшыя 2 гурткі з-за бязьдзейнасьці бюро парткалектыву разваліліся. Парткалектыў, як быццам, сваечасова ўзяўся за падрыхтоўку да зімовай партыйнай вучобы, паставіўшы гэтае пытаньне яшчэ 7 жніўня на паседжаньні бюро, дзе было пастаноўлена: на працягу 20 дзён падрыхтаваць пляны, арганізаваць гурткі, правесьці вярбоўку ў гарадзкія школы, але усё гэтае засталося на паперы.

«Дзьвіна»,

маючы даволі значны вопыт у летняй партыйнай вучобе, як работа школы аднадзёнкі, у якой было праведзена 12 заняткаў і прапрацаваны пытаньні бягучай палітыкі партыі (рацыяналізацыя, прамова т. Сталіна і г. д.), бюро партыйнага калектыву на сёньняшні дзень не правяло дастатковай растлумачальнай працы сярод членаў партыі і ўсёй рабочай масы ф-кі аб важнасьці партвучобы і ня прыступіла яшчэ да канкрэтнай работы ў справе арганізацыі і ўкамплектаваньня сеткі партасьветы.

Сьпіртазавод

нават яшчэ не абгаварыў вынікаў летняй вучобы, між тым калі ў летні час пры ячэйцы працавалі 3 гурткі — беларускі, ліквідацыі няпісьменнасьці і бягучай палітыкі.

Да зімовай партвучобы ячэйка зусім не падрыхтавана, гэтае пытаньне не абгаворана яшчэ на паседжаньні бюро і не прасунута ў гушчу рабочай масы. Мяркуецца арганізацыя партыйнай школы, гуртку па вывучэньню беларускай мовы і ліквпункту, але вярбоўкі слухачоў яшчэ не вядзецца.

На дражджавым заводзе

пытаньне аб партвучобе абгаварвалася 13 жніўня. Вылучаны таварыш па арганізацыі партвучобы. Пры ячэйцы будзе існаваць адзін гурток.

Большая частка членаў партыі будзе наведваць агульна-гарадзкія партшколы, але-ж ніякай работы ў гэтым напрамку не праводзіцца.

Піўзавод

зусім не падрыхтаваны да пачатку заняткаў. Сэкратар ячэйкі спасылаецца на тое, што ён зараз «ня мае ніякай магчымасьці займацца пытаньнямі партработы, бо, бачыце, ён замяняе дырэктара ф-кі». За летні час займаўся адзін гурток бягучай палітыкі, у які нават ня было уцягнута і паловы складу ячэйкі.

Парткалектывы і ячэйкі павінны зараз-жа па-баявому разгарнуць масавую работу сярод усёй партыйнай і рабочай масы з такім разьлікам, каб забясьпечыць сваечасовы пачатак заняткаў, рашуча ўдарыўшы па апартуністых, недаацэньваючых важнасьці партасьветы, як магутнага сродку ў справе мабілізацыі мас на выкананьне палітычна-гаспадарчых задач.

Г. Хайтовіч.

Падрыхтаваць прапагандыстых

У летні час на фабрыцы імя Лекерта займаліся тры гурткі і школа-аднадзёнка. З 230 членаў партыі было ахоплена вучобай усяго 25 проц. Таксама існавала тры гурткі па падрыхтоўцы ў партыю, праз якія прайшло 40 чал.

4-га жніўня бюро партыйнага калектыву абгаварвала пытаньне аб падрыхтоўцы да зімовай партыйнай вучобы. Зараз вядзецца вучот займаючыхся і вярбоўка ў школы і гурткі. Пачынае функцыянаваць гурток па падрыхтоўцы ў партыю. Пры парткалектыве будуць арганізаваны дзьве саўпартшколы, гурток павышанага тыпу, школа-аднадзёнка, дэлегацкія сходы і яўрэйская група.

Партыйны калектыў павінен зараз-жа заняцца пытаньнем падрыхтоўкі выкладчыцкага пэрсаналу і забесьпячэньня падручнікамі з такім разьлікам, каб сваечасова пачаць асеньня-зімовую партыйную вучобу.

Г. Хайтовіч.

Па - бальшавіцку рыхтавацца да новага нага году ў сетцы завочнай парт'асьве

Узмацненьне раёнаў марксысцка ленінскімі вытрыманымі кадрамі зьяў ляецца адзнай з важнейшых задач у справе поўнага правядзеньня генэральнай лініі партыі.

Але зараз нельга адарваць вялікую частку партыйнага актыву і паслаць яго на вучобу. Трэба працаваць і вучыцца. На дапамогу ў гэтым напрамку прыходзіць **завочнае навучаньне**.

Завочнае партнавучаньне прыстасавана да ўмоў працы раённага партактыву. Улічваючы занятасьць і нагружанасьць раённага партактыву, інстытут масавага завочнага навучаньня партактыву зьнізіў лікпісьмовых кантрольных прац, якія павінны пісаць завочнікі. Усяго за год завочнік павінен прадставіць 11 пісьмовых прац, з якіх палову можна здаць завочнай установе вусна.

У раёнах ствараюцца кансультацыйныя пункты, дзе завочнікі атрымліваюць дапамогу ў працэсе іх працы над вучэбным матарыялам. На працягу году завочнікаў скліканюць на 10 дзённыя ўступныя і 20-дзённыя заключныя курсы-канфэрэнцыі.

Для завочнага партнавучаньня скарыстоўваецца радыё.

Уся праца завочнікаў аднагадовых курсаў партактыву разьлічваецца на 10 гадзін у дэкаду, з якіх 5 гадзін адводзяцца на слуханьне радыё і 5 гадзін для працы над друкаваным ... Такая нагрузка ўпаўне ... шаму раённаму партакт...

Партарганізацыі павін... ўзяцца за ліквідацыю ... завочным партнавучаньн...

Трэба разгарнуць мас... з мэтай поўнага выкана... най разьвёрсткі, трэба ш... ліць праз сходы партяч... завочнага партнавучань... ваць завочнікаў у гурт... вучобы, якія прымацава... аўдыторый. Прымацава... аўдыторый прапагандыс... вядзеньня гутарак з зав...

Таксама неабходна ств... гарнуць сетку радыё-а... кансультацыйных punkt... чаўшы іх кіруючым скл... ляваньнем.

Неабходна разгарнуц... тычнае спаборніцтва і ... паміж завочнікамі раён... чыўшы кіраўніцтва гэты...

Толькі пры такой ув... нага партнавучаньня, а... ратварыцца ў сапраўд... партыі для падрыхтоўкі ... рыхтоўкі партыйных ка...

Дом камасьветы павінен працаваць па новаму

Віцебская партыйная арганізацыя, разам з усёй КП(б)Б змагаецца за пабудову фундамэнту сацыялістычнае эканомікі, за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады, а па асобных галінах—у тры гады.

Тыя вялізарнейшыя задачы, якія пастаўлены перад віцебскай арганізацыяй, як адной з буйнейшых арганізацый КП(б)Б, патрабуюць максымальнай упартасьці, уменьня стаяць на чале ўсё ўзрастаючага энтузіязму і ініцыятывы рабочых мас, разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, уменьня працаваць і кіраваць **па новаму.**

Гэтыя вялізарнейшыя задачы патрабуюць ад усёй партыйнай арганізацыі, а тым больш ад актыву **штодзённа, шточасна ўзброіваецца рэвалюцыйнай тэорыяй марксызму—ленінізму.** Існуючая і мяркуемая сетка школ партыйнае асьветы па Віцебску ня зможа поўнасьцю задаволіць усе гэтыя запатрабаваньні тым больш, што частка таварышоў ня зможа карыстацца ёю з за немагчымасьці адарвацца ад практычнай працы.

Дом камасьветы павінен запоўніць гэты прабел і адначасова дапамагчы сетцы школ партасьветы ў наладжваньні працы.

Дом камасьветы павінен працаваць па новаму. У першую чаргу ён павінен наладзіць мэтадычнае кіраўніцтва ўсёй сеткай партасьветы праз забясьпечаньне праграмна-мэтадычным матар'ялам, правядзеньне сэмінараў кіраўнікоў кандыдацкіх школ і гурткоў па падрыхтоўцы ў партыю, першапачатковых партыйных школ, вячэрніх саўпартшкол, дэлегацкіх сходаў і інш.

Разгарнуць масавае завочнае навучаньне праз забясьпечаньне кансультацый па ўсіх прадметах завочнага навучаньня і абсталяваньне радыё-аўдыторый для прыёму лекцый па радыё, парыядычна арганізоўваць лекцыі для актыву, а таксама кароткатэрміновыя курсы па асноўным гаспадарча палітычным пытаньням.

Праз арганізацыю працы АПО-габінэтаў дом камасьветы зьявіцца базай для падрыхтоўкі прапагандысцкіх кадраў і акажа значную дапамогу ў працы школ і гурткоў партасьветы.

Я. Пашкееў.

Парткалектыў ф-кі „Сьцяг Індустрыялізацыі" ня рыхтуецца да зімовай партвучобы

Летняя партыйная вучоба на фабрыцы **„Сьцяг Індустрыялізацыі»** праходзіла вельмі дрэнна. Заняткі праводзіліся бясплянава.

Зараз, калі набліжаецца час пачатку асеньня-зімовай вучобы, таксама ніякай падрыхтоўчай работы ў гэтым напрамку не вядзецца.

Сакратар партыйнага камітэту тлумачыць гэта тым, што гарадзкі камітэт партыі ня дае кіраўніка і прапагандыстых, але гэта толькі адгаворка.

Неабходна зараз-жа па-баявому разгарнуць масавую работу па арганізацыі партыйнай асьветы на зімовы час.

Фейгіна.

Апартуністычныя адносіны да партвучобы

(Машканы)

З 15-га верасьня па Віцебскаму раёну пачнуцца заняткі ў сетцы партасьветы. Між тым партыйная ячэйка Машканскага сельсавету аб гэтым зусім ня думае і не вядзе ніякай падрыхтоўкі да пачатку заняткаў. Трэба адзначыць, што партыйная ячэйка Машканскага сельсавету складаецца з 5 членаў КП(б)Б і 12 кандыдатаў. Камсамольскі калектыў складаецца з 35 членаў ЛКСМБ. Патрэбна паставіць партвучобу на належную вышыню з тым, каб забясьпечыць адзін з буйнейшых калгасаў Віцебскага раёну—калгас імя т. Сталіна палітычна ўзброенымі кадрамі. Сэкратар ячэйкі т. Когаль апартуністычна адносіцца да гэтае справы.

Машканская ячэйка павінна ўдарнай работай забясьпечыць сваечасовы пачатак партвучобы.

С.

Радыё—на службу завочна навучаньню

Партыйная вучоба зьяўляецца асноўным сродкам аўладаньня рэвалюцыйнай тэорыяй.

Арганізаваць у Віцебску такую сетку партасьветы, якая б цалкам ахапіла ўсю партыйную і камсамольскую арганізацыю—немагчыма, асабліва з-за перагружанасьці нашага кіруючага актыву, і тут на дапамогу павінна прыйсьці масавае завочнае навучаньне.

Завочнае навучаньне па Віцебску ў мінулым годзе ў значнай частцы была правалена. Кантрольнае заданьне ЦК па вярбоўцы ў завочны камвуз, завочную саўпартшколу і завочныя курсы актыву па радыё—ня было выканана. Замест 100 чалавек у камвуз і 100 у ВСПШ—мы ... адзінкі. Радыё для ... партвучобы на было ...

Зараз культпроп ... абавязаў віцебскую ... завярбаваць 100 та... завочны камвуз, 85 ... ВСПШ і 150 чал. н... курсы партактыву па ... маем усе магчымасьці ... канаць гэтую разьвёр...

Ячэйкі і калектыв... асаблівую ўвагу зь... арганізацыю масавага ... навучаньня, заверб... трэбную колькасьць ... і скласьці апошнім ... ўмовы для бесперабой...

Радыё трэба пас... службу масаваму ... навучаньню.

Нарада прапагандыстых і к... пропаў калектываў і ячэек

31-га жніўня, у памяшканьні дому камасьветы (клюб ... будзецца нарада прапагандыстых і культпропаў ячэек і ... КП(б)Б па пытаньням новага навучальнага году ў сетцы ... асьветы. Пачатак а 7-й гадзіне. Яўка абавязкова.

Культпроп

Улічыць памылкі мінулага году

Партвучоба ў мінулым годзе па гораду была правалена, аб гэтым кажуць матарыялы абсьледваньня брыгады культпропу ЦК у лютым месяцы г. г.

Паўкейшы самацёк, вялікі адсеў, кепская якасьць вучобы, адсутнічаньне мэтадычнага кіраўніцтва з боку культпропу і загадчыкаў камбінатаў—вось гэтыя памылкі мы павінны ўлічыць у пачатку новага навучальнага году, каб сапраўды перабудаваць сетку партыйнай асьветы—па новаму, каб ленінская вучоба дапамагла нам у вырашэньні канкрэтных задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Адсюль мы павінны змагацца, каб у дні партвучобы ператварыць завод, альбо фабрыку ў палітшколу, мабілізуючы масу на зьнішчэньне непаладак у выкананьні вытворчых заданьняў.

Трэба памятаць, што партыйная вучоба ў цэху, брыгадзе будзе адыгрываць вялізарную ролю ў сэнсе поўнага ахопу вучобай рабочых і ўцягненьня ў партыю найлепшай часткі рабочых-ударнікаў.

Трэба зараз-жа прыступіць да ўкамплектаваньня сеткі партыйных школ з тым, каб з 15-га верасьня пачаць заняткі.

Партыйныя ячэйкі павінны па-баявому дапамагчы прапагандыстым у арганізацыі партвучобы на аснове сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж заводамі і фабрыкамі на лепшае яе правядзеньне.

Р. Хайкін.

АСЕНЬНЯ-ЗІМОВЫЯ ПЕРАВОЗКІ ПАЧАЛІСЯ,

а ВІЦЕБСКІ ЧЫГУНАЧНЫ ВУЗЕЛ ЯШЧЭ НЯ СКОНЧЫЎ ПАДРЫХТОЎКУ

ПРЫВЕСЬЦІ Ў БАЯЗВУЮ ГАТОЎНАСЬЦЬ УСЕ АПЭРАЦЫЙНЫЯ АДЗІНКІ ТРАНСПАРТУ

ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ЧОТКІ РУХ ЦЯГНІКОУ ВОПЫТНЫМ ДЫСПЭТЧАРСКІМ КАМАНДВАНЬНЕМ

Пастанова камісіі выкананьня пры Віцебскім гарадзкім савеце

ад 20-га жніўня 1931 г.

ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ВОСЕННА-ЗІМОВЫХ ПЕРАВОЗАК

По ст. Віцебск

...значыць, што пастанова ...-РСІ ад 6 га жніўня ў частцы ...у рухавога складу ня выка-... На сёньняшні дзень маецца ...мантаваных 33 паравозы, пры ...гэтага дню ня вырашана пы-... аб тэрміне і месцы іх ра...

...ы агульным недахопе рабо-... вузьле маецца вялікая колькасць часовых рабочых-грузчыкаў ...л.).

...частцы забясьпечаньня раб-...узла на час восенна-зімовых ...зак, належных мер ня прыня-...льных вынікаў няма. Арганізацыя курсы нам. нач. станцый, ...гараў, стрэлачнікаў і г. д. ...аны выпускам к 1 студзеня ... тады як гэтыя кадры павінны ...ыхтавацца да часу восен-...завозак.

...дзел кадраў да гэтага часу ...анаў пастанову гарКК—РСІ ...працоўцы пытаньня аб забясь-...ні чыг. вузла рабсілай, а так-...я выканаў дырэктывы аб вы-...ні лятуноў з чыгункі і зва-... назад, на працу на транс...

Зрабіць заг. аддзелам кад-... Маскалёву рашучае папя-...ньне і прапанаваць яму ў ...ы тэрмін выканаць гэтую ды-...у.

...рапанаваць адміністрацыі 6-га ...МББ чыг. прыняць усе залеж-...ры, каб распрацаваны плян ...тоўкі да восенна-зімовых пе-...к быў выкананы ў паказаны ...е тэрмін. Асобую ўвагу ўдзя-...ытаньням якасьці рамонту ру-... складу, забясьпечыць дастат-...колькасьцю манӑўравых сродэ-...эгулярнай работай па пада-...борцы вагонаў пад пагрузку і ...ку.

...мэтах рацыянальнага скары-...ньня рабсілы вытварыць раз-... вагонаў нямедля па іх пада-...дапускаючы скапленьне гру-...осях і разгрузкі вялікімі пар-...і скарыстоўваючы ўсе нава-...і пуці, прыгодныя для раз-...

...ліквідаваць маючыяся няўвязкі ...це паасобных зьвеньняў апа-...га раёну, асабліва ў частцы ...ыянальнага скарыстоўваньня ...ы, прастояў вагонаў. Прыняць ...дныя меры да вывучэньня пры-...кучасьці і іх выжыцьця.

...апанаваць 6-му раёну МББ чыг. ...нна, пачынаючы з 21 жніўня, ...цягу дэкады падаваць па 5 ...ў для разгрузкі складаў «Са-...ю» у Чэпіна.

...апанаваць начальніку 6 га раё-...му верасьню скончыць пабу-...еткі к хлебазаводу.

...хлебу прапанаваць зараз-жа ...і сродкі на рамонт чыгунач-...ткі ў Чэпіна.

По Саюзтрансу

Ня выкананы работы па мэхані-зацыі пагруза-разгрузачных работ.

По дзяржпараходству

1. Адзначыць, што паказаньні аб мэханізацыі перавозачнага пункту ў Чэпіна ня выкананы.

Прапанаваць начальніку дзяржпараходзтва вытварыць гэтыя работы безразмоўна да 1 га верасьня.

2. К 1 му верасьню 1931 г. скончыць работу па рамонту і выпраўленьню пад'езных пуцей і Петрапаўлаўскага, Сямёнаўскага і прамога ўзвозаў каб уніканць невытворчых прастояў аўтагужтранспарту і флёту. Усю работу ўскласьці пад асабістую адказнасьць нач. дзяржпараходзтва в прыцягненнем сродкаў усіх зацікаўленых арганізацый.

3. Катэгарычна прапанаваць кліентуру, якая карыстаецца водным транспартам, у 3-дзённы тэрмін даць дзяржпараходзтву свае пляны на перавозку грузаў па месячна.

По кліентуры

1. Адзначаючы, што прадпрыемствы і ўстановы да гэтага часу ня выканалі пастановы ГарКК-РСІ ад 6 га жніўня аб прадстаўленьні транспартным арганізацыям заявак на пэрыяд восенных і зімовых перавозак,—прапанаваць апошнім, пад асабістую адказнасьць кіраўнікоў устаноў, выканаць гэтае паказаньне ў 3 дзённы тэрмін.

2. Абавязаць камтрэст, у 2 дэкадны тэрмін правесьці пракладку трамвайнага шляху да пакгаўзаў №№ 5 і 9. Начальніку 6-му раёну МББ чыг. забясьпечыць камтрэст для выкананьня гэтай работы рэйкамі.

3. Прапанаваць кліентуры пад адказнасьць кіраўнікоў належных устаноў і арганізацый бязумоўна поўнасьцю выканаць усе паказаньні пастановы ГарКК-РСІ ад 6 га жніўня г. г. у частцы падрыхтоўкі складзкіх памяшканьняў, тары і бесьперабойнай працы апарату па разгрузцы і прыёму грузаў.

4. Прапанаваць Белдзяржбуду ў дэкадны тэрмін скончыць рамонт складаў «Саюзхлебу» у Чэпіне.

5. Папярэдзіць кіраўнікоў прамтрэсту аб недапушчальнасьці запяжкі рамонту млынаў і прапанаваць ім скончыць гэтыя работы к 1 му верасьню.

6. Адзначаючы недахоп складзкай плошчы для «Саюзхлебу», прасіць Масжэлдорстрой пададаць (а л ь б о здаць у арэнду) «Саюзхлебу» 3 дашчатыя склады пры станцыі Віцебск, належачыя 4-му вучастку Масжэлдорстроя, спыніўшаму сваю працу.

7. У канцы месяца заслухаць справаздачу міжведамственнай камісіі па рэгуляваньню восенна-зімовых перавозак.

ЗМАГАЙЦЕСЯ ЗА РЭКОРДНЫЯ ТЭМПЫ,

за поўнае выкананьне пляну асеньня-зімовых перавозак, ЗА ПЯРШЫНСТВО НА ЎСЕСАЮЗНЫМ КОНКУРСЕ НА ЛЕПШУЮ «ПАРАВОЗНУЮ БРЫГАДУ»

Адозва прэзыдыуму ЦСПСБ і другога пленуму Белбюро ЦК чыгуначнікаў

Да ўсіх рабочых, служачых, інжынэрна-тэхнічнага і гаспадарчага пэрсаналу чыгуначнікаў БССР

ТАВАРЫШЫ ЧЫГУНАЧНІКІ!

Вялізарныя задачы, пастаўленыя партыяй перад рабочай клясай у справе рэканструкцыі і аздараўленьня чыгуначнага транспарту, у справе выкананьня трансфінпляну ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі ўскалыхнулі самыя шырокія масы рабочае клясы, у тым ліку чыгуначнікаў. Разгорнуты на аснове пастановы чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б), адозвы УсеЦСПС, ЦК чыгуначнікаў і НКШЗ усесаюзны конкурс на лепшае дэпо, станцыю, дыстанцыю, акалодак, на л е п ш у ю п а к а з а л ь н у ю работу паасобных адзінак транспарту, усё больш узьнімае энтузіязм рабочых-чыгуначнікаў, які выяўляецца ў лепшых паказальніках работы ў штодзённым разгортваньні гэройскіх прыкладаў сацыялістычнай працы.

У Гомельскім раёне арганізавана 28 ударных паказальных брыгад па зьмене шпал, якія замест заданьня — 14 даюць 32 шпалы на чалавека.

Ударны цягнік С—312, які абслугоўваецца машыністамі Дзянісавым і Шульгай, за час з дня абвяшчэньня конкурсу дабіліся наступных вынікаў: ніводнага спазьненьня з цягнікамі, ніводнага здарэньня зрыву спаранай язды, самі выконваюць рамонт цягніка ад прамыўкі да прамыўкі.

Ст. Ворша па выкананьні сваіх вымяральнікаў зьяўляецца лепшай па МББ і ўваходзіць кандыдатам ва ўсесаюзны конкурс.

Віцебскі вузел: цягнік С—74 на чале з машыністам т. Сямак і т. Капітонавым маюць нагон у пуці, не зрабілі ніводнага спазьненьня ў дарозе, ёсьць эканомія апалу, добрыя адносіны да паравозу, барацьба за замацаваньне спаранай язды і г. д.

Па Жлобінскім раёне: паравоз сэрыі «Щ» на чале з машыністам т. Тамковым і таварышом Байкачовым у маі месяцы з'эканомілі апалу 15.022 кгр., у чэрвені—1 030 кгр., эканомія на рабочай сіле ў маі—63 р 85 к., у чэрвені—166 р. 89 к., з эканомілі змазачных, абдзірачных і асьвятляючых матар'ялаў за май—чэрвень—37 р. 9 кап.

Ударная брыгада пуцейскіх работ у складзе т.т. Скорабагатага, Чорнага, Яўзова, Гарэліка пад кіраўніцтвам старшага дарожнага майстра 29-й дыстанцыі, і брыгада ст. Урэчча пад кіраўніцтвам дарожнага майстра т. Сяргеенкі прыстасавалі вопыт т. Кацура на зьмене шпал і зараз мяняюць за мест 14 шпал 31 шпалу на чалавека.

Гэтыя ўзоры сапраўднай ударнай работы штодзённа ўзрастаюць і ахапляюць усё больш і больш рабочыя масы чыгуначнікаў.

Але гэтыя посьпехі далёка невыстарчальны для выкананьня задач, пастаўленых перад чыгуначным транспартам. Яшчэ ня ўсе рабочыя ахоплены ўдарніцтвам і сацспаборніцтвам, кепска пастаўлен улік і кіраўніцтва сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам, ва многіх мясцох ёсьць выпадкі злоснага парушэньня працоўнай дысцыпліны, прагулаў, п'янства, спазьненьня на работу і г. д., напрыклад:

па гомельскім дэпо за першую пяцідзеўку жніўня з-за няўкі на работу машыністаў т.т. Новіцава, Асіпенкі і Гішкова стварыўся зрыў спаранай язды.

Па Віцебскім вузле: машыністы т. т. Войцік і Хрыловіч п'янствуюць, не зьяўляюцца на работу, чым тармозяць работу транспарту.

Па Жлобінскім раёне на ст. Асіпавічы сьлясарная брыгада ў складзе т.т. Элькіна, Шахловіча, Дударава, Навалюк і Максімава не зьявілася на работу і прагуляла 4 гадзіны, чым груба парушыла працдысцыпліну.

Рабочы сход ст. Асіпавічы пастанавіў—злосных парушыцеляў працдысцыпліны прыцягнуць да адказнасьці, з перадачай справы ў таварыскі суд.

Усе пералічаныя недахопы гавораць аб непадрыхтаванасьці чыгуначнага транспарту да аднэй з баявых і чарговых задач—да асеньня-зімовых перавозак, усе яны б'юць па якасьці рамонту, перашкаджаюць замацаваньню спаранай, пераходу на гаспадарчы разрахунак і ліквідацыі абязьлічкі.

Усё гэта патрабуе самай рашучай барацьбы і ўзмацненьня кіраўніцтва па-новаму з боку прафсаюзных і гаспадарчых арганізацый.

Прэзыдыум ЦСПСБ і другі пленум Белбюро ЦК чыгуначнікаў цалкам і поўнасьцю далучаецца да пастановы УсеЦСПС і ЦК чыгуначнікаў і заклікаюць усіх рабочых, служачых, інжынэрна-тэхнічны і гаспадарчы пэрсанал чыгуначнікаў Беларусі ўключыцца па-баявому ў абвешчаны ўсесаюзны конкурс па сацспаборніцтву паравозных брыгад на званьне лепшай брыгады і лепшага машыніста СССР па выкананьні вытворчых паказальнікаў.

ЦСПСБ і белбюро ЦК чыгуначнікаў упэўнены, што маса чыгуначнікаў, вядучы штодзённа барацьбу за рэкордныя паказальнікі на транспарце, высуне са сваіх радоў дзесяткі лепшых сваіх паравозных брыгад і машыністаў, вартых свайго субрата, машыніста курскай дарогі т. Гамаюнава, у кандыдаты на ўсесаюзнае прэміяваньне.

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі—за рэкордныя тэмпы на чыгуначным транспарце!

За 100-процантнае замацаваньне спаранай язды!

За кіраўніцтва па-новаму і сапраўдную перабудову прафработы.

За 100-процатнае выкананьне пляну асеньня-зімовых перавозак.

Прэзыдыум ЦСПСБ і другі пленум Белбюро ЦК чыгуначнікоў

ІТР кіраўніцтва 6-га эксплёатацыйнага раёну МББ чыгункі

дае пралетарскі абавязак працаваць па ўдарнаму

Інжынэрна-тэхнічныя работнікі 6-га эксплёатацыйнага раёну МББ чыгункі, абмеркаваўшы на мітынгу ІТР пастанову ЦВК і СНК аб палепшаньні матар'яльна-бытавых умоў інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў, вітаюць гэту пастанову і заяўляюць:

Мы, інжынэры і тэхнікі, патроім энэргію і возьмемся за поўнае ажыцьцяўленьне задач, пастаўленых партыяй і ўладай перад транспартам. Мы абавязуемся па баявому падрыхтавацца к восенна-зімовым перавозкам, забясьпечыўшы высокую якасьць правядзеньня гэткіх.

Усе свае веды і сілы аддадзім для падрыхтоўкі рабочых да падвышэньню сваёй кваліфікацыі і аўладаньню тэхнікай.

Мы мабілізуем сябе на барацьбу за поўнае выкананьне прамфінпляну, на барацьбу з абязьлічкай ва ўсіх зьвеньнях нашай гаспадаркі, за здаровы паравоз, за замацаваньне спаранай язды, за правядзеньне гаспадарчага разрахунку.

Прымаючы выклік, бюро эксплёатацыі Маскоўска-Курскай чыгункі аб пабудове эскадрыльлі „Чырвоны спэцыялісты", мы ўносім аднадзённы заробак на пабудову эскадрыльлі і выклікаем ІТР усяго раёну і гораду Віцебску пасьледваць нашаму прыкладу.

Да 14-й гадавіны Кастрычніка эскадрыльля „Чырвоны спэцыялісты" павінна ўступіць у шэрагі чырвонага паветранага флёту.

Па даручэньню мітынга ІТР

Землякоў,
Чарнышоў,
Дунц.

Адказному вучастку Віцебск—Н.-Сакольнікі патрэбны вопытныя дыспэтчары

На вучастку Віцебск - Новасакольнікі ў суткі праходзіць 20—22 пары цягнікоў. Становішча гэтага вучастку патрабуе чоткай апэрацыйнай работы ад агентаў дарогі. Патрэбна мець кадры вопытных дыспэтчараў. Між тым, на гэтае пытаньне адміністрацыя раёну абсалютна не зварачвае ўвагі.

Надыходзяць асеньня-зімовыя перавозкі, павялічваецца рух цягнікоў, а ў 6 м раёне МББ чыгункі ў гэты пэрыяд заняліся адпускной кампаніяй. Усе пашлі ў адпачынак, а на лініі ўвялі трохзьменнае дзяжурства. На вучастку Віцебск—Новасакольнікі дыспэтчары пастаўлены слабыя, якія не спраўляюцца з сваёй работай і уносяць перашкоды ў рух цягнікоў. Так, дыспэтчар Лук'янава затрымлівае адпраўленыя паравозы на пуці і зварачвае іх назад у зваротнае дэпо, няправільна рэгулюе рух цягнікоў. 21-га жніўня на ст. Взярышча затрымана было тры паравозы і два цягнікі з-за непараспараджальнасьці дыспэтчара. Дыспэтчары вучастку Віцебск—Новасакольнікі ўвесь час зрываюць пагрузку экспартнага грузу, прысылкай брудных—з-пад вугалю і гною вагонаў. 24-га жніўня дыспэтчар Кузьнечыкаў прыказам у пісьмовай форме прапанаваў дзяжурным па станцыі адпраўляць цягнікі адзін усьлед за адным, што не прадугледжана ніякімі правіламі і недапусьціма. Гэтага ж ліку па віне Кузьнечыкава на ст. Взярышча быў пакінуты груз і не паданы вагоны падэкспарт. Маецца шэраг іншых незаконных парушэньняў правіл руху цягнікоў.

Каб зьбегнуць затору руху цягнікоў у час напружаных асеньня-зімовых перавозак, неабходна ўмацаваць вучастак вопытнымі дыспэтчарамі і зьнішчыць усе ненармальнасьці ў руху цягнікоў.

Праезжы.

ВЭЙНІК!! ВАМ ПРАД'ЯЎЛЯЕЦЦА РАХУНАК: ВЫ ПАВІННЫ ДАЦЬ ДОБРАЯКАСНУЮ ПРАДУКЦЫЮ

...вільнае камплектаваньне ў закройнай, адсутнасьць элемэнтарнага кантролю за рухам паўфаб...рыкатаў у істужцы—асноўная прычына ганебнай колькасьці браку на швэйным волаце

...ГОРНУТЫМ ФРОНТАМ—У ПАХОД ЗА ДОБРАЯКАСНУЮ ПРАДУКЦЫЮ

Якасьць—у цэнтр увагі ўсёй грамадзкасьці

...ны волат—адзін з «518», ...ся зараз у глыбокім прарыве. ...ўшы вытворчую праграму ...варталу з перавышэньнем, ...та ў ліпені і за першыя два ...кніўня ганебна здала бальшэ-...гэмны. За 15 дзён праграма ...на ўсяго на 87 1 проц. ...ас існаваньня фабрыкі выпра-...на 11 млн. руб. тавару. За ...паўгодзьдзе сабекошт пра-...ці быў зьніжаны на 2,2 проц. ...6,5. Сума, патрачаная на ...бкі, у 22 разы перавышае ...гледжаны прамфінпляном. ...раробкі заплачана 30 тыс. ...Становішча яшчэ больш пад-...цца дрэннай якасьцю выпра-...май прадукцыі. Толькі ўлічы-...даткі на пераробкі ў другім ...е складаюць 420 тыс пе-...ам ці каля 3 млн. бруч-...пвацый.

...із вытворчага браку, агульны ...т якога складае ў чэрвені па-...ах 10,5 проц., а па брунках—...ц., паказвае, што 50 60 проц. ...акаваных вырабаў падае на ...дэталяў і прыладаў, што ...ецца вынікам няправільнай ...ктоўкі ў закройнай і адсут-...элемэнтарнага кантролю за ...паўфабрыкатаў у істужцы.

...ёньняшні дзень у цэхах маюц-...ежы тавару на 600 тыс. руб. ...я адміністрацыя, а таксама ...ня ня прымаюць належных ...для ліквідацыі завалаў. У па-...а цэху завалы даходзяць да ...паліто, 6 тыс. пінжакоў ...ыс. пар брук. Было разьлі-...что будуць работаць чатыры ...ныя машыны, але работаюць ...дзьве. Для ручных пецель ...алася пасадзіць 30 рабочых, ...ы працуюць з перабоямі. Усё ...начна адбіваецца на якасьці ...цыі.

...кройным цэху работа ў знач-...упені тармозіцца з-за адсут-...ь машынак. Працуюць усяго 4 ...кі, што пагражае спыненьнем ...нага цэху. Прымаюцца меры ...бесьпячэньня цэха машынамі. ...торыя інструктары за ігнара-...дырэктыў аб якасьці перада-...у вытворчага трыбуналу.

...ыхтоўка кадраў пастаўле-...сама дрэнна. 485 вучняў фабза-...рацуюць у брыдкіх умовах, у ...ым памяшканьні, адсутнічае ...е сьнеданьне, сталоўка і г. д.

Якасьць прадукцыі, вырабляемая ФЗВ, вельмі дрэнная. Адміністрацыя замест таго, каб прымаць належныя крокі ў гэтым напрамку, гоніцца за колькасьцю.

Адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал фабрыкі надзвычайна мала ўвагі зварочвае на якасьць прадукцыі. Для ліквідацыі прарыву абвешчаны двухдэкаднік штурму. 19 га жніўня адбыўся зьлёт ударнікаў, які вынес шэраг канкрэтных практычных прапаноў, якія павінны быць зараз-жа ажыцьцяўлены. У конкурс, абвешчаны па фабрыцы на лепшы вытворчы вучастак, павінны ўключыцца ўсе цэхі, агрэгаты, істужкі, групы, брыгады. Заваёва першынства павінна стаць справай гонару кожнага ўдарніка, кожнага рабочага.

На фабрыцы «Прафінтэрн» таксама маюцца значныя прарывы па колькасных і якасных паказальніках прамфінпляну. За паўгодзьдзе было зроблена пераробак на 15.532 руб. Ватны цэх знаходзіўся ў вельмі дрэнных умовах і яго прышлося разгрузіць і перавесьці ў цэх паліто. Якасьць ватніка дрэнная, няроўная строчка і няроўна накладаецца вата. У палітовым цэху з-за няўважлівых адносін да работы значна пагаршаецца якасьць прадукцыі. Не абстрачваецца ў падбарту падкладка, у паўпаліто ня робіцца бакавая кішэня і г. д.

Склікаемая на 30-га жніўня канфэрэнцыя па якасьці прадукцыі швэйнай прамысловасьці, разам з прадстаўнікамі грамадзкіх арганізацый гораду, спажыўцамі і работнікамі прылаўку павінна з усёй рашучасьцю паставіць пытаньне аб зьнішчэньні недахопаў у выкананьні якасных паказальнікаў прамфінпляну. Канфэрэнцыя павінна патрабаваць ад усяго кіраўніцтва, тэхнічнага пэрсаналу і рабочых фабрык добрасумленных адносін да сваіх абавязкаў і тэрміновай ліквідацыі ўсіх недахопаў у якасьці прадукцыі.

А. Кузьняцоў.

Узмацніць кантроль і самакантроль рабочых

Якасьць прадукцыі зьяўляецца «вузкім» месцам у рабоце палітовага цэху фабрыкі «Прафінтэрн».

На апэрацыі № 1 адсутнічае нагляд за добраякасным раскроем палёкалу. Кантралёр Эфрос прапускае рукавы без насечак, а кантралёр Яльсіноўсі прапусьціў пачку рукавоў са зрэзанымі галавінамі. На апэрацыі № 2 слаба прышываюцца ярлыкі. Брак з закройнай пускаецца ў работу без усякага кантролю. На 11-й апэрацыі пры стачваньні бакавых швоў насечкі сьпінак і пол не супадаюць. На апэрацыі № 20 рэдка высьцёгваюцца лацканы — замест 8 радоў 4.

На складанай апэрацыі—заўцюжка пол работае некваліфікаваны рабочы Барадулін, які з сваёй работай не спраўляецца. На 27-й апэрацыі лямоўкі падбартоў не стачваюцца, а кладуцца адна на адну, што адмоўна адбіваецца на правільным адстрачваньні лямак. Падрэзка падбартоў вытвараецца не па лёкалу, а «на вока», у выніку чаго падбарты атрымліваюцца няроўныя. Ніжнія каўняры стачваюцца няроўна, вылазяць швы. На апэрацыі № 32 рабочы Комін прышывае кромку на барты шырокім швом. На апэрацыі № 116 парусіна падбартоў ня прымётваецца да канца. Кантралёр Семчанка адкладае паўфабрыкат для пераробак, але інструктары і намазагадчыка цэху т. Крупенін не пераробленыя палуфабрыкат пускаюць далей у канвэер. Гузікі і кручкі ў паліто ўшываюцца слаба. Кантралёр Кацаў прапускае нядобраякасную работу. Адміністрацыйна - тэхнічны пэрсанал у пагоні за колькасьцю не зварочвае ўвагі на якасьць прадукцыі.

Вялікая колькасьць пераробак і браку ў палітовым цэху—вынік адсутнасьці кантролю, асабліва на першым вучастку — і мабілізацыі рабочых мас на барацьбу за якасьць. Далей цярпець такое ганебнае становішча нельга. Патрэбны тэрміновыя меры. Барацьба за якасьць—гэта фронт, на які павінна быць мабілізавана ўся рабочая маса фабрыкі. Трэба зьняць з апэрацый тых, якія не спраўляюцца з работай. Кантроль і самакантроль рабочых павінен быць узмацнён.

Рабкоры-ўдарная брыгада: Крупніц, Я. Курноў, Фельдман.

Ніводнай школы без ячэйкі МОПР

Заслухаўшы інфармацыю прадстаўніка гаркому МОПР'у аб шалёным катаваньні і масавых забойствах барацьбітоў рэвалюцыі, пакутуючых у польскіх дыфэнзывах і турмах, мы, настаўнікі гор. Віцебску і раёну, рашуча, з абурэньнем пратэстуем супроць драконаўскага рэжыму над палоньнікамі за справу працоўных усяго сьвету. Няхай ведаюць ненавісныя каты і здраднікі—паны Астроўскі і К-о, што ім не задушыць міжнароднага рэвалюцыйнага руху, што наступіць час, калі хваля міжнароднага рэвалюцыйнага руху зьмяце іх з твару зямлі.

Мы, настаўніцтва, у адказ на тэрор фашысцкай Польшчы абяцаем прыняць усе меры да разгортваньня інтэрнацыянальнай кампаніі—зімовай дапамогі барацьбітом за сусьветную рэвалюцыю і іх сем'ям. Адлічваем ад свайго заробку адзін процант.

З першага дню навучальнага году разгарнём інтэрнацыянальна - выхаваўчую працу сярод вучнёўства, зьвязаўшыся з дзяцьмі зарубежных барацьбітоў за рэвалюцыю.

Ні воднай школы без ячэйкі МОПР і ні воднага вучня, які-б ня быў актыўным членам МОПР'у!

Будзем актыўна ўдзельнічаць ва ўзмацненьні сацыялістычнага будаўніцтва нашай краіны, стварэньні чырвоных абозаў са збожжам, запашкі шэфскіх палосак МОПР'у і г. д.

Трыкутнік ф-кі „Дзьвіна"

У АДКАЗЕ ЗА ЗРЫЎ РАЦЫЯНАЛІЗАТАРСКАЙ РАБОТЫ

Узьняць на належную вышыню рацыяналізатарскі і вынаходчаскі рух, неадкладна праводзіць у жыцьцё каштоўныя прапановы рабочых

Апартуністычная практыка трыкутніку прывяла да зрыву рацыяналізатарскай работы на фабрыцы „Дзьвіна"

На старонках друку мы неаднаразова сыгналізавалі аб дрэнных умовах работы бюро рацыяналізацыі і бязьдзейнасьці апошняга на ф-цы «Дзьвіна».

Арганізаванае па загаду дырэктара 1 красавіка 1931 г. бюро рацыяналізацыі з першых-жа дзён свайго існаваньня ня мела кіраўніцтва і паказаньняў у рабоце ні з боку тэхнічнага кіраўніка, ні з боку дырэктара. Бюро рацыяналізацыі, склаўшы плян, па якому была прадугледжана эканомія ф-кі ад рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў на 72.324 р. і зьніжэньне сабекошту на 6,9 проц. — у сваёй штодзённай рабоце ня ўжыла належных мер, каб гэтыя плянавыя намёткі ператварыць у жыцьцё.

Бюро рацыяналізацыі не мабілізавала актыўнасьці рабочых мас ф-кі, не скарыстоўвала вытворчай сьмякалкі кваліфікаваных рабочых. Рабочыя прапановы да 2 ліпеня нават не рэгістраваліся. Пасьля 2 ліпеня паступіўшыя 45 рабочых прапаноў ня былі скарыстаны. «Каштоўных рабочых прапаноў няма, а таму і не рэагавалі»—вось думка кіраўнікоў ф-кі.

Бюро рацыяналізацыі было адарвана ад мас. Яно займалася выключна фармальнай тэхнічнай працай. Замест таго, каб зрабіць нараду ў цэху, бюро рацыяналізацыі ўвесь час абмяжоўвалася папяровым кіраўніцтвам.

Работніцы ватэрнага цэху неаднаразова ўзьнімалі пытаньне аб цесных катушках, але голас іх і друку засталіся непачутымі. «Прапанова малакаштоўная і дробязная»—адказвалі ўвесь час кіраўнікі ф-кі, а між тым гэтыя «дробязі» прыносяць шмат страты ф-цы. Пасьля рамонту рамонту ф-кі дзіркі ў катушках ня спраўлены, не рассартаваны і работніцы выкідваюць катушкі ў гразь разам з намотанай сыравінай, потым іх мыюць і зноў падаюць работніцам, у выніку чаго ствараецца псота сыравіны.

Паміж тэхнічным пэрсаналам і адміністрацыяй увесь час былі непаладкі. Увязкі ў працы бюро рацыяналізацыі і дырэкцыі ня было. Пры правядзеньні рацыяналізатарскай работы ствараліся склокі. Бюро рацыяналізацыі ў апошні час існуе толькі на паперы. Старшыня бюро рацыяналізацыі пашоў у двухмесячны адпачынак, а другія члены пераведзены на іншую работу.

У рабоце бюро рацыяналізацыі існавала абязьлічка. Трыкутнік фабрыкі не дапамагаў арганізаваць і разгарнуць рацыяналізатарскую работу ў цэхах. Бюро парткалектыву і наогул трыкутнік фабрыкі зараз усю віну ўскладаюць выключна на бюро рацыяналізацыі. Трыкутнік фабрыкі ўвесь час па-апартуністычнаму адносіўся да рацыяналізатарскай работы. Арганізаваўшы фармальна бюро рацыяналізацыі, трыкутнік фабрыкі нічога не зрабіў, каб дапамагчы інжынэру і двум тэхнікам, якія ўваходзілі ў склад бюро, разгарнуць працу. Сваёй апартуністычнай нячуласьцю трыкутнік дапусьціў склокі, няўвязкі паміж тэхнічным кіраўніком, бюро рацыяналізацыі і дырэкцыяй і тым ўкосна садзейнічаў зрыву рацыяналізатарскай работы.

Зараз у рацыяналізатарскай рабоце на фабрыцы павінен быць зроблены рашучы пералом. Новаму бюро рацыяналізацыі трэба забясьпечыць нармальныя ўмовы працы. Трыкутнік фабрыкі павінен аказваць інжынэрна-тэхнічным сілам, якія ўваходзяць у склад бюро рацыяналізацыі, практычную дапамогу шляхам мабілізацыі ўсёй вытворчай энэргіі і сьмякалкі рабочых фабрыкі.

Вышэйшыя партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі павінны прыцягнуць трыкутнік фабрыкі, які дапусьціў зрыў рацыяналізатарскай работы, да суровай адказнасьці.

Гр. Максімаў.

Каштоўная рабочая прапанова

Рабочая сьмякалка—магутны вагар зьніжэньня сабекошту

На абутковай ф-цы імя Лекерта ўнесена каштоўная прапанова аб пабудове стала для складаньня халста. Доўгі час гэта прапанова ня выконвалася, кіраўнікі прадпрыемства ня верылі, што гэта прапанова дасьць эканомію ў раскрою халста і толькі дзякуючы ўпартай настойлівасьці бюро вынаходцтва, удалося стол пабудаваць, і налі раскроілі першы кавалак халста ў 675 мэтраў, атрымалася эканомія на 10 пар абутак—гэта вдзначае, што на працягу аднаго дню, дзякуючы вынаходзтву, можна з'эканоміць 70 мэтраў халста. Зараз на фабрыцы гэтае мерапрыемства ажыцьцяўляецца.

Б.

За асобы квартал 1930 г. на абутковай фабрыцы Лекерта унесена ўсяго 74 рабочых прапановы, што складае з агульнай колькасьці рабочых 0,65 проц. Эфэктыўнасьць гэтых прапаноў складае 118,602 р. За першы і другі кварталы ўнесена 128 прапаноў, што складае 1,26 проц. да агульнай колькасьці рабочых. Рабочыя прапановы разглядаюцца ў 3-дзённы тэрмін. Для выкананьня іх таксама маюцца вызначаныя тэрміны. На паседжаньнях БРІЗ абгаварваліся рабочыя прапановы, прынятыя і даючыя эфэкт прэміруюцца. БРІЗ усе свае пастановы даводзіць да ведама рабочых шляхам вывешваньня сваіх пастаноў, гутарак і г. д. Арганізаваны абмен вопыту з іншымі прадпрыемствамі. Чарцяжы найбольш каштоўныя прапаноў накіраваны аб растварыцелі ацытона, аб тэксаправодніку і г. д.

Бэйлінсон.

НОВАЯ ПАНЧОШНАЯ ІМЯ КІМ'у

К XVII МЮД'у ПАВІННА — ЎСТУПІЦЬ У СТРОЙ

НЯ СПЫНЯЦЬ БАРАЦЬБЫ ЗА ПЕРАТВАРЭНЬНЕ КАМСАМОЛУ Ў ШМАТМІЛЬЁННУЮ АРГАНІЗАЦЫЮ

ГАРПРАФСАВЕТ І НІЗАВЫЯ ПРАФЭСЫЯНАЛЬНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ СЛАБА ЎДЗЕЛЬНІЧАЮЦЬ У ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА МЮД'у

Pierwsza konferencja polskiej młodziezy robotniczo-chłopskiej w Witebsku

Pod kierownictwem partji Lenina kraj Rad osiągnął niebywały wzrost na wszystkich odcinkach i frontach budownictwa socjalistycznego i w trzecim decydującym roku Pięciolatki kończy budowę fundamentu socjalistycznej ekonomiki.

Potężny rozmach industralizacji, kolektywizacji i socjalistycznej kultury BSRR został osiągnisty w wyniku urzeczywistnienia leninowskiej polityki narodowościowej i ostrej walki przeciwko wrogowi klasowemu.

Urzeczywistnienie leninowskiego hasła „dopędzić i prześcignąć pod względem techniczno-ekonomicznym kraje kapitalistyczne" wymagazdecydowanej walki przeciwko wszelkim wypaczeniom leninowskiej polityki narodowościowej partji i wzmocnienia systematycznej pracy wsród mniejszości narodowoscciowych. Tym się charakteryzuje znaczenie pierwszej konferencji polskiej młodzieży robotniczo-chłopskiej, którą zwołuje w Witebsku Miejski Komitet K. Z. M. 3 września b. r.

Zadanie konferencji wyznaczyć wytyczne l i n j e systematycznej pracy wzród polskiej młodzieży robotniczo-chłopskiej i tym samym wzmocnić jej udział w budownictwie socjalistycznym.

Ogarnąc polską młodzież robotniczo-chłopską współzawodnictwem socjalistycznym, szturmowstwem,

Bujewicz.

ДА СЕМНАЦЦАТАГА МЮД'у, НЕ ПАЗЬНЕЙ

Ініцыятыву гаркому камсамолу па ўзяцьці шэфства над новай панчошнай фабрыкай і пускам яе к 17-му МЮД'у неабходна вітаць і поўнасьцю адобрыць. Гэтае рашэньне праводзіцца ў жыцьцё і за апошні час, у выніку дапамогі гаркому камсамолу, на фабрыку выйшлі для дапамогі ў яе працы і датэрміновым яе сканчэньні чырвонаармейскія часткі і асобныя ячэйкі КСМ гораду. Гэтую дапамогу ні ў якім разе нельга паслабіць, а наадварот, у застаўшыяся 8 дзён неабходна ўзмацніць.

Для таго, каб забясьпечыць першачарговасьць пуску фабрыкі, нам неабходна да 1-га верасьня ня менш **500 рабочых дзён** для сканчэньня каналізацыі і вадаправоду і гэтую колькасьць **павінен даць камсамол.**

Будаб'яднаньне павінна фарсіраваць сканчэньне ў 3-х корпусах асфальтавых падлог, пліты і перагародкі—у аднапавярховым корпусе. Адсутнічаньне цэменту пагражае пабудове. Усе работы, зьвязаныя з цэментам, спынены. Па маючымся нарадам цэмент будзе атрыманы толькі праз 10 дзён.

На маслазаводзе маецца вялікая колькасьць цэменту, які ляжыць без патрэбы і апошні павінен яе даць для таго, каб не сарваць сваечасовы пуск фабрыкі. «Прамвэнтыляцыя» павінна поўнасьцю забясьпечыць да пуску фабрыкі паравую сетку, абсталяваць каларыферныя камеры ў фарбовачным корпусе, вытяжную вэнтыляцыю і г. д. «ВЭО» павінен зараз-жа забясьпечыць пуск падстанцыі, пракладку кабеля і ўстанавіць галоўны шчыт. Бялдзяржснаб павінен даць неабходны матарыял, у асаблівасьці сьвінец, фіцінгін і г. д.

Камсамольская арганізацыя «Чырвоны мэталіст» павінна безадклада прыняць меры да атрыманьня з заводу падшыпнікаў, кранштэйнаў і шківаў, бо завод гэтых заказаў сваечасова ня выконвае і ў выніку няма ніякай магчымасьці пускаць прыбываючыя панчошныя кецельныя і аўтамашыны.

Сэктар кадраў павінен забясьпечыць новую фабрыку рабочымі. У бліжэйшыя 4 месяцы фабрыцы патрабуецца 1500 работніц і гэтая колькасьць павінна быць прадастаўлена. Камсамольская арганізацыя павінна зараз-жа ўзяцца і дапамагчы ў вярбоўцы рабочай сілы.

Неабходна адзначыць, што з боку грамадзкіх арганізацый фабрыкі Клары Цэткін не ўдзяляецца дастатковай увагі новай фабрыцы ў сэнсе пасылкі кваліфікаванай рабочай сілы, патрэбнай для навучаньня ўліваючыхся ў фабрыку новых рабочых.

Толькі пры актыўным удзеле ўсёй рабочай грамадзкасьці гораду і камсамольскай арганізацыі, увяўшай шэфства над сканчэньнем пабудовы фабрыкі мы з посьпехам выканаем стаячыя перад намі задачы і пусьцім фабрыку к 17-му МЮД'у.

Фрэйдзін.

Тэмпы росту не здаваць

З 15 чэрвеня камсамольская арганізацыя фабрыкі «Прафінтэрн» вырасла на 150 чал.; ішоўшы спачатку, ўперадзе па росту, ватні цэх за апошні час тэмпы росту значна аслабіў. За 20 дзён жніўня ватні цэх вырас толькі на 28 камсамольцаў, палупалітовы—на 13, тэхчастка—на 2 і дзетпаліто зусім ня мае росту. Гэта гаворыць аб тым, што бюро цэхавых ячэек забыліся аб правядзеньні ў жыцьцё лёзунгу аб 100-проц. охопе ўсёй рабочай моладзі камсамолам. Ячэйкі бязьдзейнічаюць. Дрэнна яшчэ і тое, што слаба вядзецца работа сярод навічкоў, што кладзе свой адбітак на замацаваньне росту. Атрымаўшы членскія білеты, навічкі не ўцягваюцца ў грамадзкае жыцьцё фабрыкі.

Усё гэта трэба ўлічыць і застаўшыяся дні да 17 га МЮД'у трэба ператварыць у штурм па росту нашай арганізацыі і замацаваньні навічкоў.

Лёзунг «Ніводнага маладога рабочага па-за шэрагамі КСМ» павінен ва што-б та ні стала быць ажыцьцяўлён.

У—ы.

Замацаваць дасягненьні

Камсамольская ячэйка махорачнай фабрыкі па баявому ўзялася за ажыцьцяўленьне лёзунгу аб ператварэньні камсамолу ў шматмільённую арганізацыю. Рабочая моладзь, у выніку праводзімай масавай работы, уступае ў рады камсамолу. Зараз на фабрыцы акамсамолены два цэхі, у якіх налічваецца 32 камсамольца, а ўсяго на фабрыцы 44, між тым як толькі месяц таму назад было ўсяго 25 камсамольцаў. Неахопленых камсамолам налічваецца ўсяго 18 чал., ад якіх штодзённа паступаюць заявы.

Перадана ў партыю 4 лепшых камсамольца-ударніка, арганізаваны дзьве маладзёжныя брыгады імя IX зьезду камсамолу, якія да МЮД'у пераходзяць на гаспадарчы разрахунак.

Шалыт.

Напярэдадні пуску новай панчошнай фабрыкі

(Ад кантрольнага паста гаркому ЛКСМБ)

— За пэрыяд з 16 па 25 жніўня на пабудове па земляным работам—каналізацыі і вадаправоду адпрацавала на камсамольскіх суботніках—679 асоб. На пабудове працавалі ячэйкі: лесзаводу, скурзаводу, рахункаводныя курсы, белдзяржбуд, №-скі полк, авіяарыгада і інш.

— У Менск выяжджаў прадстаўнік гаркому ЛКСМБ па пытаньню абсталяваньня для новай панчошнай. Пры ЦК ЛКСМБ была склікана спэцыяльная гаспадарчая нарада зацікаўленых арганізацый. Частка абсталяваньня, неабходная для пуску, ужо адгружана ў Віцебск.

— Пры заводзе «Чырвоны мэталіст" створан камсамольскі скразны кантрольны пост па нагляду за сваечасовым вырабам абсталяваньня для панчошнай ф-кі.

— На новай панчошнай ф-цы прыбыла 36 работніц з Магілёву—выхаванцы дзіцячага дому, але з за дрэннай выхаваўчай работы сярод іх, дрэнных жыльлёвых умоў, частка работніц уехала. Фабком ф-кі і ячэйка КСМ павінны лепш паставіць выхаваўчую работу сярод уноў прыбываючых работніц.

— Работніцы ф-кі на другіх зьменах не снабжаюцца гарачымі абедамі і наогул снабжэньне пастаўлена вельмі дрэнна. ЗРК панчошнай фабрыкі неабходна прыняць тэрміновыя меры.

— Пры ф-цы да гэтага часу няма партячэйкі. Гаркому КП(б)Б неабходна арганізаваць пры ф-цы партячэйку.

— ЦП саюзу шоўк-трыкатаж, таксама гарпрафсавету неабходна ўзмацніць прафработу на фабрыцы. Старшыня фабкому фабрыкі—работніца, вылучэнка фабрыкі Клары Цэткін ня можа ахапіць усю работу з-за адсутнасьці дастатковага кіраўніцтва і дапамогі. На фабрыцы маецца шмат прагулаў, лятунства і г. д.

— Ня гледзячы на пастанову гаркому КП(б)Б і гарсавету, аддзел кадраў біржы працы да гэтага часу вусім не забясьпечвае будаўніцтва рабочай сілай. За жніўвень на пабудову аддзел кадраў даслаў вельмі малую колькасьць рабочых.

— Для пуску фабрыкі неабходна правесьці вускакалейку для падвозкі апалу для катлоў. Для вускалейкі не хапае 200 мэтраў рэйк. Гэтыя рэйкі маюцца ў значнай колькасьці на фанэрным заводзе, але дырэкцыя заводу сама іх не скарыстоўвае і другім таксама не дае. РСІ неабходна зацікавіцца гэтай справай.

Работу з навічкамі—на адпаведную вышыню

Камсамольская арганізацыя ФЗВ абутнікаў імя Фабрыцыўсу за апошні час значна вырасла, але з навічкамі ніякая культурна-выхаваўчая работа не праводзіцца. Гурткі адсутнічаюць, аб «ленінскай вахце» ніхто і ня ведае.

Ня лепш абстаіць справа і з палітасьветработай сярод старых камсамольцаў, якія ў большай частцы зьяўляюцца ня дысцыплінаванымі і зьяўляюцца непрыкладнымі для астатняй моладзі.

На усё гэтае камсамольская ячэйка не рэагуе.

Неабходна замацаваць маючыйся зрух у росьце камсамольскай ячэйкі шляхам правядзеньня адпаведнай паліт-выхаваўчай работы, уцягнуўшы навічкоў у грамадзкую працу.

Цырульнікаў.

Абавязковая пастанова № 4 Віцебскага гарсавета

ад 17-га жніўня 1931 г.

Для падняцьця на належны вень супроцьпажарнай аховы гасах, калгасах і інш. будынках, а таксама ў мэтах запачаньня ад пажару прыналежнасьці—збожжа, жывога і інвэнтару і інш., Віцебскі гарсавет, згодна пастановы СНК ад 23-га ліпеня г. г., у дадатак абавязковай пастановы гарсавета № 25 пра захады супроцьпажарнай аховы ў прыгарадных сельсаветах **пастанаўляе:**

1. Ва ўсіх саўгасах і калгасах устанавіць сталую варту для ахаваньня ад пажару прыналежнай ім маёмасьці—збожжа, абагуленага жывога і мёртвага інвэнтару і інш.

2. Месцы хаваньня абагуленай маёмасьці—склады збожжа і інш. забясьпечыць супроцьпажарнымі камі.

3. Забараніць курыць ва ўсіх забясьпечных у пажарных адносінах мясцох—складах, хлявах, на полах і інш., а таксама вытвараньку снапоў у небясьпечных у пажарных адносінах ёўнях.

4. Кожнаму саўгасу і калгасу лучыць пэрсанальна адказнага супроцьпажарную ахову ўнутраных, на якіх усклаць працу не ўсіх мерапрыемстваў супроцьпажарнай аховы і праверку ня аховы вартай.

5. Асобы, вінаватыя ў парушэньні гэтай абавязковай пастановы, вязковай пастановы гарсавета № 25 г. г., падлягаюць адказнасьці ў адміністрацыйным парадку, штрафу да 100 руб., альбо прымусовым работам—да 15 дзён.

6. Нагляд за выкананьнем абавязковае пастановы ўскладзены вылучаных па калгасам і саўгасам пэрсанальна адказных за супроцьпажарную ахову ўпаўнаважанага жарнага інструктара і рабочай міліцыю.

7. Гэтая абавязковая пастанова ўступае ў сілу праз 5 дзён з апублікаваньня ў друку і развешваецца на ўсе прыгарадныя сельсаветы.

Старшыня гарсавету **Жук**

Сэкратар гарсавету **Прамо**

Нарада камісіі па сьвяткаваньню 14-й гадавіны Кастрычніка

30-га жніўня, а 5 гадз. увечары, у памяшканьні гарсавету № 23), адбудзецца **нарада камісіі па сьвяткаваньню 14-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі**, на якую павінны зьявіцца наступныя таварышы: **Азаранкава** (гарком), **Зьвягін** (гарпрафсавет), **Смо** (гарком КСМ), **Калінін** (заг. домам Чырв. арміі), **Ланціхоўскі** ныя), **Арнштэйн** (мастацкі тэхнікум), **Саламовіч** (Белдзяржтэатр), **Педэр** (начальнік гарміліцыі), **Дымшман** (Белдзяржкіно), а т. прадстаўнікі з прадпрыемстваў: «Сацпрацаг індустрыялізацыі», «Чырвоны мэталіст», чыгункі, «Дзьвіны» і панчошнай ф-кі.

Яўка памянёных таварышоў **абавязкова.**

Нарада сэкратароў сельпарт'ячэек і членаў партыі—кіраўнікоў саўгасаў, калгасаў, сельсаветаў і сельрабачкомаў

3-га верасьня, у памяшканьні клюбу гаркому партыі (Замкавая, 26) а 12 гадзіне дня, склікаецца нарада сэкратароў партсельячэек і членаў партыі—кіраўнікоў саўгасаў, калгасаў, сельсаветаў і сельрабачкомаў, па пытаньню аб праламленьні жыцьці пастановы пленуму гаркому ад 26-га ліпеня аб поўнай дове сельскай гаспадаркі.

Гарком КП(б)Б

Ogłoszenie

Dnia, 3 września b. r. w lokalu klubu Miejskiego Komitetu Partyjnego (Zamkowa 26) odbędzie się konferencja polskiej młodzieży robotniczo-chłopskiej zwołana przez Miejski Komitet KZM z następującym porządkiem dziennym:

1. O położeniu młodzieżu robotniczo-chłopskiej w Polsce faczystowskiej.
2. O zadaniach polskiej młodzieży pracującej ZSRR.

Początek o 6 godzinie wieczór.

1-га верасьня—пачатак заняткаў у школах

Даводзіцца да ведама ўсіх грамадзян гораду Віцебску і раёну, што заняткі ва ўсіх школах пачынаюцца 1-га верасьня.

30-га жніўня будзе праведзены пробны выхад вучняў у школы. Усе вучні гораду і вёскі павінны зьявіцца ў школы роўна а 9 гадзіне раніцы

— Гарпрафсавет і гаршэфсавет склікае нараду на 30-е жніўня, а 6-й гадзіне увечары, у памяшканьні Палацы працы (пакой 25), на якую павінны зьявіцца ўсе ФЗМК, прафпаўважаныя і вылучаныя адказныя тав., якія прымацаваны да асобных калгасаў і ўстаноў—па пытаньні замацаваньня сапраўднай вядзельнічыне ў калгасах і арганізацыі культмасавай працы. На нарадзе прадставіць спіскі адказных тав. за гэту работу.

Лепшы падарунак 17-му МЮД'у

Па ініцыятыве камсамольцаў рамонтна-мэханічнага цэху голкавай фабрыкі арганізавана брыгада рамонтных сьлесароў з 5 ці асоб. Брыгада прыступіла да практычнай працы.

Парэжынскі.

Канфэрэнцыя інжынэрна-тэхнічных работнікаў

30-га жніўня, а 6-й гадзіне вечары, у памяшканьні клюбу гаркому партыі (Замкавая 26) адбудзецца шырокая канфэрэнцыя інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў прамысловых прадпрыемстваў гораду.

На канфэрэнцыю павінны зьявіцца ўсе члены інжынэрна-тэхнічных сэкцый прадпрыемстваў. Запрашаюцца старшыні ФЗМК.

Гарком КП(б)Б, ГарпрафСавет, рэдакцыя «Віцебскі Пралетары».

Час. вык. аб. рэдактара **Н. Баруноў**

УЗП **БЕЛДЗЯРЖТЭАТР**

Біл. прад. у касе тэатр. з 12 да 2 гадз. дня і з 5 да 10 гадз. увеч. І ў гарадзкой касе—Ленінская, 2, ад 11 г. раніцы да 5 гадз. увеч.

ГАСТРОЛІ ЛЕНІНГРАДЗКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ТЭАТРУ АКТОРСКАГА МАСТАЦТВА.

Сёньня, у суботу, 29 га жніўня, **ПРАЎДА ДОБРА, А ШЧАСЬЦЕ ЛЕПШ** камэдыя ў 4-х дзеях.

У нядзелю, 30 жніўня, **Залатыя берагі**

Пач. а 8½ гадз. увеч.

ГАРТЭАТР (Канатная вуліца). **ГАСТРОЛІ РАСІЙСКАЙ ОПЭРЫ** пад кіраўніцтв. Я.Е. Воўкава.

Сёньня, у суботу, 29-га жніўня, **РУСАЛКА** ў 6 малюнках, муз. Даргамыскага.

Нядзеля, 30-га жніўня, **Чыо-Чыо-Сан** у 3-х дзеях, муз. Пучыні.

Пачатак а 8½ гадз. увеч. Білеты ў касе тэатру з 12—2 і з 5—10 г. і ў гарадзкой касе (Ленінская, 2) з 11—5 г.

БЕЛДЗЯРЖКІНО З панядзелка, 23-га жніўня

МАСТАЦКІ Пачатак 1-га сэансу а 7 г. З 25-га жніўня мастацкі фільм **Злодзей** Звыш праграмы „ВЕЧАР ПАМЫЛАК" з удзелам Чарлі Чаплінa.

ПРАЛЕТКІНО Пачатак 1-га сэансу а 6½ г. Толькі 1 дзень: сёньня, 29 жніўня, **Стэпы болот** Звыш праграмы замежны фільм **ХРЫЗАНТЭМА**

Усім установам, фабрыкам і заводам гор. Віцебску!

У разьвіцьцё пастановы прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б і калегіі НК РСІ БССР ад 7-га ліпеня г. г., аб зборе газэтных архіваў, Віцебская гар. РСІ і КК, у мэтах мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, забесьпячэньне папяровых фабрык БССР макулятурай, маючыя ў сучасны момант вострую патрэбу ў сыравіне, а таксама для скарачэньня ўвозу імпортнай драўніны і целюлёзы, прапануе ўсім прадпрыемствам, фабрыкам і заводам гор. Віцебску паміма навучальных установаў і бібліятэк на працягу 10 дзён здаць Белуцілю ўсе газэтныя архівы да 1930 г. уключна.

Прадажа газэтнай макулятуры ЦРК і іншым гандлёвым прадпрыемствам для мэты абвёртакі—забараняецца.

Гар. РСІ НК. 1200—3—2

Даводзіцца да ведама ўсіх установаў і прадпрыемств г. Віцебску, што **належачае здачы Белуцілю** **ГАЗЭТНЫ АРХІЎ,** згодна пастановы НК РКІ, **прымаецца на складзе Белуціля—па Комсамольскай вул., № 41, тэлефон № 3 23.**

Нарыхтоўчы пункт Белуціля. 1219—2—1

Усім прадпрыемствам і арганізацыям Віцебшчыны і Полаччыны!

З прычыны дэфэктыўнасьці дагавароў **Белдзяржснабу** з яго спажыўцамі, заключаныя на 3 і 4 квадру 31 году **лічуцца ануліраванымі.**

Для ўтачненьня і пераскляданьня дагавароў устанаўляецца апошні тэрмін да 5 га верасьня 1931 году.

Прадстаўнікі пры яўцы для перазаключэньня дагавароў павінны мець пры сабе даручэньне для подпісу гэтага дагавору і спэцыфікацыю неабходных матар'ялаў з адгрузкай на месяцам, пры чым спэцыфікацыя па фондавым матар'ялам павінна быць аснована па фактычна вылучаным фондам.

Аслабаняюцца ад яўкі наступныя арганізацыі, якія дагаворы перазаключылі: **Яшавіцкі вінзавод, шагельны завод прамтрэсту, ануляриая фабрыка, торпараспрацоўкі Даўмана, шкляны завод, фабрыка гнутай мэблі, абоз прамтрэсту, ветэрынарны інстытут, завод „Камінтэрн" і Сампрамсаюз.**

З 5 га верасьня г. г. усім прадпрыемствам, якія не перазаключылі дагавары, тавар адпушчацца ня будзе.

1210—2—2 **БЕЛДЗЯРЖСНАБ** Віцебская кантора

Прыём для перазаключэньня дагавароў ў БЕЛДЗЯРЖСНАБУ

да 5-га верасьня г. г. будзе вытвараецца спэцыяльна апэрацыйным штабам з 5 гадз. дню да 12 гадз. ночы.

БЕЛДЗЯРЖСНАБ.

Ogłoszenie

Dnia 29-go o godzinie 9-ej w. w lokalu Polskiego klubu Robotniczego, odbedzie się wieczór Polskiej litaratury Proletarjackiej.

Program wieczoru:

1. Sprowozdanie z wszechzwiązkowego zjazdu Polskich Pisarzy Proletarjackich.
2. Wyjątki z polskiej litaratury proletarjackiej.
3. Część koncertowa.

1209—2—2 Zarząd klubu.

Даводзіцца да ведама прамыслова-каапэрацыйных арцеляў і насельніцтва г. Віцебску і раёну, што **швэйная фабрыка „ПРАФІНТЭРН"** вытварае **ПАКУПКУ** за наяўны разьлік

ШВЭЙНЫХ МАШЫН

16-й і 31-й клясы са станкамі і без станкоў, а таксама і абмен на белашвэйныя машыны 15-й клясы.

З прапановамі зьвяртацца ў кіраўніцтва фабрыкі: Канатная вул., № 66.

ДЫРЭКЦЫЯ ФАБРЫКІ. 1187—5—3

Да ведама вучняў і настаўнікаў!

У нядзелю, 30-га жніўня, роўна а 9 гадз. раніцы, **усе настаўнікі і вучні ўсіх зьмен павінны зьявіцца па сваіх школах на заняткі.**

Інспэктар сацвыху 1216—2—2 **Гіндзіна.**

ФОТО-АПАРАТ

9×12 ці менш **ЖАДАЮ КУПІЦЬ ЦІ АБМЯНЯЦЬ** на 13×18 Герца. Пісьмова — ст. Езярышча, 1. Заблоцкаму. 1154—1—1

МЯНЯЮ ПАКОЙ

ў Адэсэ ў цэнтры з усімі ўдобствамі, разьм. 2,5 саж. на пакой у Віцебску. Адрас: Віцебск, Галубятніцкая, 4, Крамскай. 1211—2—1

Наркамфін БССР

АБВЯШЧАЕ

восенны набор на 1-ы курс укоў арганізаванага,

згодна пастановы СНК БССР ад 24-га ліпеня 1931 г.,

фінансава-вучотнага тэхнікума

у гор. ВІЦЕБСКУ

ў колькасьці 150 чалавек.

Тэхнікум мае мэтай падрыхтоўку вучотна-эканамічных работнікаў для ўсіх галін народнае гаспадаркі—г. зн., бухгальтэраў—інструктараў, бухгальтэраў і пам. бухгальтэраў для прамысловасьці, сельскай гаспадаркі, гандлю і фінансава-банкаўскай сыстэмы.

Тэрмін навучаньня 2 з паловай гады.

У тэхнікум прымаюцца бяз іспытаў асобы, скончыўшыя 7-гадовыя школы, альбо роўныя ім навучальныя ўстановы, іншыя асобы павінны дзяржаць іспыты, згодна агульна-устаноўленых правіл па грамадазнаўству, белмове і літаратуры, матэматыцы, фізыцы і прыродазнаўству.

Асобы, жадаючыя паступіць у тэхнікум, павінны падаць заяву і прыкласьці наступныя дакуманты:

а) аб узросьце, б) аб адносінах да вайсковай павіннасьці (копія), в) аб адукацыі, г) аб стане здароўя, д) аб сацыяльным і матар'яльным становішчы паступаючага і яго бацькоў, е) аб выбарчых правах паступаючага і яго бацькоў, ж) для калгасьнікаў—даведку калгаса, для аднаасобнікаў—копію акладнога лісту за 1931 г. і з анкету, пасьведчаную прафэсыянальнымі і савецкімі арганізацыямі раённага маштабу.

Асобы, залічаныя студэнтамі тэхнікуму, забясьпечваюцца стыпендыяй і інтэрнатам на агульных падставах эканамічных тэхнікумаў.

Узрост паступаючага—ад 18 да 32 год.

Заявы прымаюцца да 5-га верасьня 1931 г. па адрасу: гор. Віцебск, ГарФА, з надпісам: для фін-вучотнага-тэхнікуму, пакой № 10.

Іспыты адбудуцца з 5-га па 10-е верасьня.

Аб залічэньні і часе заняткаў будзе паслана паведамленьне кожнай асобе.

1136—4—3 **Сэктар кадраў НКФ БССР.**

З 25 га гэтага жніўня АДЧЫНЕН ПРЫЁМ у наступныя

рабочыя школы-камбінаты 1-га і 2-га канц. (зьменныя):

1. Рабочая школа імя «Парткамуны», якая прымацавана да прадпрыемстваў мэталёвай прамысловасьці (Вагзальная вул., памяшканьне 7-й сямігодкі).
2. Рабочая школа імя «Крупскай»—харчовай прамысловасьці (Вагзальная, № 4, у памяшканьні 4-й сямігодкі).
3. Рабочая школа імя «Леніна»—скуранай прамысловасьці (Гогалеўская, 15, у памяшканьні 9-й сямігодкі).
4. Рабочая школа імя «Вінчэўскага»—дрэваапрацоўчай прамысловасьці і рабочыя будаўнікі (вул. Леніна, 3|2), у памяшканьні 6-й сямігодкі).
5. Рабочая школа пры ф-цы «Дзьвіна» (памяшканьне ФЗВ).
6. Рабочая школа чыгуначнікаў (памяшканьне 4-й чыгуначнай сямігадовай школы).
7. Рабочая школа для прадпрыемстваў тэкстыльнай прамысловасьці (вул. Талстога № 3).

Для рабочых, саўгасаў і калгасаў адчынены групы пры школе імя Леніна.

Астатнія групы працоўных, як-та: работнікі прылаўку, чырвонаармейцы і працаўнікі міліцыі і г. д. могуць залічацца ў адну з вышэйпамянёных школ.

Для залічэньня ў школы неабходна атрымаць анкеты ў ФЗМК ці ў канцэлярыях школ і зацьверджаныя прадставіць у школу.

Нацыянальныя сэктары адчынены пры ўсіх памянёных школах-камбінатах.

Інспэктар палітасьветы пры Віцгарсавеце **Чарнян.** 1194—3—2

ПРАДАЕЦЦА РАДЫЁЎСТАНОЎКА з 3-лямпавым прыёмнікам. Бачыць з 5 да 9 г. увеч., па вул. Бебе д. № 77|2. 1214—1

ПАТРАБУЕЦЦА ХАТНЯЯ ПРАЦАЎНІ Запытать: Бальша кая, № 16, Палякову 1217—1

Згублены і ўкрадзены ніжэйпаказаныя дакументы, якія лічыць несапраўднымі:

Па гораду:

Паяв. кн. ЦРК і ўкл. картка прамтав., наб. прадукт. лісты В. І. Сухаровай

Пропуск панч. фабрыкі № 3068 М. М. Шэстаковай

Дзьве мэтрыкі Л. і У. Нікалаевых

Два хлебн. лісткі ЗРК Ф. А. Шагалавай

Пасьв. асаб. чыгункі і праязды білет К. І. Быстрыкава

Пэнс. інв. кн. П. Д. Ласкага

Паяв. кн., два прамтав. і прад. наб. лісты № 5419 і ўкладн. картка да паяв. кн. ЗРК М. Я. Матросавай

Прамтав. прадукт. і наб. ліст ЗРК В. М. Эйдэльман

Пропуск швэйн. фабрыкі «Прафінтэрн» Н. К. Ганчаровай

Пропуск панч. фабрыкі О. К. Байковай

2 закр. талёны абл. «Пяцігодка ў чатыры гады» М. Я. Івіцкай

Вайск. дакум. А. В. Рубіна

Паявая кн. ЦРК № 67197 і ўкл. картка да паяв. кн., заборн., прамтав., прад. наб. лісты стар. і нов. № 2464 І. О. Емельянава

Разьлік. лісток і квіток на атрым. аванс. орд. Н. Т. Ганчарова

Выпуск № 1. Друкарня «Камінтэрн», Замкавая, 10. Тыраж 10.000